Голас Радзімы

№ 29 (2171)
19 ліпеня 1990 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.

ГОРАД БЕЛАЙ ВЕЖЫ







...І з[illegible]ў князь Валынскі Уладзімір Васільевіч баярыну [illegible]ексе: «...За Берестием сруби город на пустом месте, нарицаемом Лесна, и нареце имя ему Каменец, за не бысть земля каменна. С здаже в нём столп каменен высотою 17 заженей подобен удивлению всем зрящим...» Так гаворыць аб падзеях далёкіх дзён Іпацьеўскі летапіс 1276 года.


Больш за сем стагоддзяў стаіць на заходніх рубяжах зямлі нашай горад Камянец. А сімвалам непарушнасці межаў узвышаецца над ракой Лясной трыццаціметровы слуп — легендарная Камянецкая вежа, вартая здзіўлення не толькі нашых продкаў, але і сучаснікаў. Не паддалася яна націску літоўскіх дружын, не стала здабычай рыцараў-крыжаносцаў, вытрымала выпрабаванне часам. Размешчаны на гандлёвых шляхах, Камянец таксама славіўся сваімі багатымі кірмашамі.

Сучаснасць наклала на аблічча старажытнага горада ўласцівыя ёй рысы. Тут выраслі новыя жылыя раёны, з'явіліся ўстановы культуры, медыцыны. Толькі шкада, што будаўніцтва часта падмінае пад сябе стаўшыя ўжо нешматлікімі гістарычныя [illegible] Камянца. Знік стары млын, спыніў існаванне цэц[illegible] мастацкага ліцця, пайшлі пад знос будынкі былой земскай бальніцы... Аб цэрквах ужо і гаварыць не даводзіцца. У пяцідзесятыя гады ў раёне было разбурана, знішчана больш за 25 цэркваў, тры з іх — XIII стагоддзя. Нанесены непапраўны ўрон матэрыяльнай і духоўнай гісторыі краю. Можа, не так прыкметна, як у вялікіх гарадах, але і ў Камянцы адбываецца ломка старых паняццяў, звычак, жыццёвага ўкладу. І сёння тут усё часцей гучаць словы аб неабходнасці адраджэння культуры, духоўнага абнаўлення грамадства. Гэты нялёгкі працэс, у якім павінны знайсці месца ўсе аспекты выхавання: пазнанне мастацтва, павага да працы, захаванне гістарычнай памяці, шанаванне рэлігіі — ужо пачаўся.

НА ЗДЫМКАХ: семсот шаснаццаць гадоў Камянецкай вежы; удзельніца фальклорна-этнаграфічнага калектыву з вёскі Навіцкавічы Камянецкага раёна Тамара ІГНАЦЮК; новыя кварталы Камянца; від на стары Камянец; службу ў мясцовай царкве адпраўляе свяшчэннік Аляксей СКУЛАВЕЦ.

Фота Я. КАЗЮЛІ.





ЗАКОНЧЫЎСЯ З'ЕЗД

ВЫБРАНЫ КІРАЎНІКІ ПАРТЫІ

У Маскве завяршыў работу XXVIII з'езд КПСС. Акрамя пленарных пасяджэнняў, ішла работа ў тэматычных секцыях, адбыўся шэраг сустрэч партыйных кіраўнікоў з дэлегатамі. Напрыклад, М. Гарбачоў і М. Рыжкоў сустрэліся з рабочымі і калгаснікамі — удзельнікамі XXVIII з'езда партыі. Атрымаўся ажыўлены абмен меркаваннямі аб праблемах сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, месцы і ролі КПСС у грамадстве, міжнацыянальных адносінах, стане грамадскага парадку і дысцыпліны.

У ходзе работы дэлегаты прынялі шэраг рэзалюцый і сярод іх «У абарону дэмакратычных правоў супраць ганенняў на камуністаў». У.ёй, у прыватнасці, гаворыцца: «Дэмакратыя несумяшчальная з прыніжэннем чалавечай годнасці, стварэннем атмасферы нянавісці і помсты, спробамі пад рознымі выглядамі паставіць па-за законам кампартыі і грамадскія рухі сацыялістычнай арыентацыі як такія, усіх іх членаў і прыхільнікаў. Нельга пераносіць на іх адказнасць за дзеянні адхіленых часам рэжымаў. Ва ўмовах абвешчанага грамадзянскага супольніцтва ганенні па палітычных матывах і псіхалагічнае ганенне з'яўляюцца нецярпімымі і выклікаюць пачуццё горычы і пратэсту, дзе б такога роду з'явы ні давалі аб сабе знаць за рубяжом або ў нашай уласнай краіне».

Не абышлося ў час работы з'езда і без сапраўднага скандалу. Пасля сустрэчы сакратара ЦК КПСС А. Якаўлева з маладымі камуністамі сярод дэлегатаў была распаўсюджана лістоўка з груба скажонай скарочанай стэнаграмай яго адказаў на пытанні. Сярод іншага А. Якаўлеву прыпісваліся выказванні, ацэнкі, якіх ён не даваў. А. Якаўлеў апратэставаў гэтыя неафіцыйныя звесткі, назваў іх нічым не абгрунтаваным вымыслам. На з'ездзе была створана спецыяльная камісія, якая павінна разабрацца з гэтым інцыдэнтам.

На з'ездзе адбыліся выбары Генеральнага сакратара ЦК КПСС. Пасля разгляду вылучаных кандыдатур у спіс для тайнага галасавання былі ўключаны былы старшыня стачачнага камітэта шахцёраў з Кемераўскай вобласці, горны інжынер, а зараз сакратар гаркома кампартыі з невялікага шахцёрскага гарадка Кісялёўск Таймураз Аваліані і Міхаіл Гарбачоў. Перамогу атрымаў М. С. Гарбачоў, які зноў, на другі пяцігадовы тэрмін, стаў лідэрам партыі. Яго першым намеснікам абраны У. Івашка, які яшчэ да выбараў падаў у адстаўку з пасады Старшыні Вярхоўнага Савета Украіны. Яго сапернікам у гэтых выбарах выступаў сакратар ЦК КПСС Я. Лігачоў.

У сваім выступленні па выніках абмеркавання палітычнай справаздачы М. С. Гарбачоў сярод іншага ўзгадаў і чарнобыльскае пытанне. Ён сказаў: «Балюча ўсіх нас закранаюць вынікі чарнобыльскай аварыі. Прашу таварышаў з Беларусі, з Украіны, Браншчыны разумець, што мы перажываем разам з імі іх бяду.

Мы сутыкнуліся з сітуацыяй, якая падно[illegible] нам усё новыя і новыя праблемы. І гэта, дарэ[illegible] падстава для вялікіх разважанняў. Адзін рэактар, а глядзіце, якія вынікі! Велізарная краіна не можа з ходу з імі справіцца. Мільярды рублёў ужо затрачаны, а з'яўляюцца ўсё новыя і новыя патрэбы. Я хацеў бы, каб у Беларусі, на Украіне, на Браншчыне пачулі гэтыя мае словы і ведалі, што ўся краіна з імі, разумее іх бяду і будзе дапамагаць».

На адным з апошніх пасяджэнняў з'езд прыняў праграмную заяву «Да гуманнага, дэмакратычнага сацыялізму».

У ВЯРХОЎНЫМ САВЕЦЕ РЭСПУБЛІКІ

ЗОНА ЭКАЛАГІЧНАГА БЕДСТВА

Вярхоўны Савет Беларусі аб'явіў рэспубліку зонай нацыянальнага экалагічнага бедства. Пастаяннаму прадстаўніку БССР у ААН даручана давесці гэта да сусветнай грамадскасці.

Пайсці на такі крок дэпутатаў вымусіла сітуацыя, у якой аказалася рэспубліка пасля чарнобыльскай катастрофы.

Рэакцыя на гэта рашэнне парламента рэспублікі неадназначная. На думку некаторых правазнаўцаў, такія рашэнні павінны грунтавацца на законе, што рэгламентуе асобы прававі рэжым падобных зон. Такога рэжыму ў нашай краіне няма. Без прызнання Беларусі зонай экалагічнага бедства ў ААН рашэнне Вярхоўнага Савета не мае прававых вынікаў.

А вось думка старшыні надзвычайнай камісіі Вярхоўнага Савета БССР па праблемах катастрофы на Чарнобыльскай АЭС І. Смоляра.

— Так, закона па падобных сітуацыях у СССР няма. Аб ім, думаецца, трэба было ўжо пагаварыць на З'ездзе народных дэпутатаў СССР, у Вярхоўным Савеце краіны. Нехта павінен зрабіць першы крок. Беларусь яго зрабіла... Мы будзем працаваць над статусам падобных зон.

Пры Савеце Міністраў БССР ствараецца Дзяржаўны камітэт па праблемах вынікаў катастрофы на ЧАЭС. Ствараецца таксама нацыянальная камісія па радыяцыйнай абароне насельніцтва. Будзе арганізавана і Упраўленне па кантролю за захаваннем радыеактыўных адходаў і могільнікамі. І, вядома ж, павінна быць распрацавана сістэма пазаведамаснага і грамадскага кантролю за працай зямлі харчавання.

МАЛАДЗЁЖНЫ РУХ

НА РЫНАК ІДЭЙ

Статус юрыдычнай асобы атрымала новая грамадская арганізацыя — Беларуская асацыяцыя маладых вучоных і інжынераў. Яна аб'яднала на добраахвотных пачатках творча актыўных спецыялістаў у розных галінах ведаў: прыродазнаўчых, тэхнічных, медыцынскіх і гуманітарных. Галоўнай сваёй мэтай актывісты асацыяцыі ставяць далучэнне маладых вучоных да сусветнага навукова супольніцтва.

— Мы імкнёмся да развіцця міжнародных кантактаў, каб забяспечыць доступ савецкіх спецыялістаў да замежных камп'ютэрных сетак і банкаў даных, — гаворыць старшыня асацыяцыі, навуковы супрацоўнік Інстытута цепла- і масаабмену АН БССР Кірыл Дабрэга. — Цяпер наладжваем кантакты з рознымі навуковымі і грамадскімі арганізацыямі ў пошуку новых форм міжнароднага абмену навукова-тэхнічнай інфармацыяй. Ужо маем дзелавыя прапановы з Італіі, Грэцыі, Ірландыі на стажыроўку аспірантаў і кандыдатаў навук.

Але знешнеэканамічнымі сувязямі не вычэрпваецца дзейнасць асацыяцыі. Яе актывісты плануюць матэрыяльную падтрымку праектам маладых вучоных, якія не знайшлі належнай увагі на практыцы.

ЗАРЭГІСТРАВАНА АРГАНІЗАЦЫЯ БНФ

ЛЁД КРАНУЎСЯ

Прэзідыум Гомельскага гарадскога Савета народных дэпутатаў зарэгістраваў (цытуем назву даслоўна па дакументах) гомельскую гарадскую грамадскую арганізацыю Беларускі народны фронт, яе статут і праграму.

Асноўныя палажэнні праграмы новай грамадскай арганізацыі — барацьба за няўхільнае захаванне правоў чалавека, падтрымка розных форм уласнасці, садзейнічанне ў ліквідацыі вынікаў чарнобыльскай катастрофы, прыцягненне ўвагі ўлад да ўдасканалення сістэмы народнай адукацыі, удзел у адраджэнні нацыянальнай культуры, узважаны падыход да вырашэння нацыянальных пытанняў...

Заканадаўча прызнаны і рух за перабудову «Адраджэнне» ў Фрунзенскім раёне Мінска.

ЗЛАЧЫНСТВА

КРАДЗЕЖ ГОДА

У Мінску з лабараторыі дазіметрыі і ацэнкі радыяцыйнага становішча Навукова-даследчага інстытута анкалогіі і медыцынскай радыялогіі Міністэрства аховы здароўя Беларускай ССР выкралі камп'ютэр з данымі аб стане здароўя 670 тысяч чалавек, якія пацярпелі ад аварыі ў Чарнобылі.

Паводле слоў міністра аховы здароўя рэспублікі В. Казакова, практычна перакрэслена напружаная работа соцень спецыялістаў на працягу [illegible]рох гадоў.

Газеты Беларусі апублікавалі паведамленне аб гэтым, без усякага сумнення, крадзяжы года. Яны звярнуліся з просьбай да грабежнікаў вярнуць дыскеты з бясцэннай інфармацыяй, да ўсяго насельніцтва — паведаміць, калі хто-небудзь штонебудзь ведае пра крадзеж. Таму што ад г[illegible]а, без перабольшання, залежыць здароўе і [illegible]ё цэлага народа.

Крадзеж камп'ютэраў становіцца амаль што масавай з'явай: яны дорага каштуюць, значыць — тавар ходавы.

ДЗЕЛАВОЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА



Няма прэтэнзій да партнёраў у беларускага філіяла савецка-югаслаўскага прадпрыемства «Аўтаінфа». Яго заснавальнікі—Маскоўскі навукова-даследчы інстытут тэхналогіі аўтамабільнай прамысловасці і бялградская фірма «Інфарматыка» дабіліся таго, каб праграміруемыя кантралёры, якія выпускаюцца тут, былі высоканадзейнымі і канкурэнтаздольнымі.

НА ЗДЫМКУ: за вырашэннем праблем інжынернага забеспячэння новых сістэм спецыяліст па інжынерынгу Аляксандр ЦЫЕР, намеснік генеральнага дырэктара па камерцыйных пытаннях Уладзімір ВІНЕЛЬ, спецыяліст па камплектацыі і збыту Валерый КАМАРОЎ і спецыяліст па эканоміцы і фінансах Валянцін ЧАМЯНЁЎ.

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАВА

ДА РЭАЛЬНАЙ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

Гэтыя словы прагучалі з вуснаў Старшыні Вярхоўнага Савета БССР Мікалая Дземянцея. У вялікім, грунтоўным інтэрв'ю карэспандэнту БЕЛТА ён заявіў: «На ўзроўні звычайнай свядомасці значэнне паняцця суверэнітэт у нас сцерлася. Цяпер далёка не ўсе ўяўляюць, што яно на самай справе азначае. А на самай справе суверэнітэт ёсць не што іншае, як вяршэнства рэспублікі, яе незалежнасць у вырашэнні асноўных пытанняў унутранага і знешняга жыцця, дзяржаўнага, эканамічнага і сацыяльна-культурнага будаўніцтва».

І далей: «Нягледзячы на афіцыйнае прызнанне Канстытуцыяй СССР саюзных рэспублік суверэннымі дзяржавамі, у літаратуры, у перыядычным друку, у штодзённым побыце людзей — практычна ніхто ніколі не гаворыць «Беларуская дзяржава». Усе гавораць: «Беларуская рэспубліка». Быццам бы адно і тое ж, але не зусім. Выраз «Беларуская рэспубліка» цяпер у шырокіх масах асацыіруецца з выразам «Беларуская дзяржава». Маленькі нюанс, але ён гаворыць пра многае.

Думаю, што наша першарадная задача — надаць беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці рэальны, а не толькі фармальны сэнс».

Старшыня Вярхоўнага Савета рэспублікі лічыць, што валоданне ўсёй паўнатой дзяржаўнай улады дае магчымасць накіраваць развіццё вытворчых адносін іншым шляхам, чым яно ішло да гэтага часу.

Вось пацвярджэнне. Па многіх паказчыках эканамічнага развіцця — і прамысловасці, і сельскай гаспадаркі — наша рэспубліка займае, без перабольшання, нядрэнныя пазіцыі. Аднак пры цяперашнім узроўні нашай самастойнасці ў складзе Саюза ССР, колькі б беларускі народ ні нарошчваў аб'ёмы вытворчасці, колькі б ні дабіваўся зніжэння сабекошту прадукцыі, усе намаганні рэспублікі могуць быць зведзены практычна да нуля некалькімі няўдалымі і бездаказнымі рашэннямі так званага цэнтра.

Возьмем апошнія гады. Пры агульнай правільнай канцэпцыі пераходу да рынку, з забеспячэннем належнага ўзроўню сацыяльнай абароненасці насельніцтва, многія канкрэтныя рашэнні былі няўдалымі. Гэта тая ж адмена кантролю за прыростам заработнай платы і цэн пры тым, што ўсе іншыя элементы новага гаспадарчага механізму не атрымлівалі фактычнага развіцця і нават стрымліваліся. Усё гэта адмоўна адбілася на выпуску тавараў і прадуктаў харчавання.

Спадзявацца, што ў будучыні палітыка цэнтра ў галіне эканомікі стане выключна рацыянальнай, — таких гарантый няма. Апошнія мерапрыемствы па пераходу да рынку, намячаемыя саюзным урадам, прымушаюць сумнявацца ў тым, што ён здольны зрабіць гэта дастаткова аптымальна. М. Дземянцей прывёў прыклады пагардліва-паблажлівага падыходу цэнтра ў адносінах да рэспублік і канстатаваў той факт, што амаль усюды на ўзроўні Саюза ССР выразна відаць тэндэнцыя дыктаваць рэспублікам, як ім жыць.

У дэкларацыі аб суверэнітэце, якую мае прыняць Вярхоўны Савет БССР, на думку М. Дземянцея, павінна быць дакладна заяўлена, што Беларуская дзяржава прызнае, паважае і, больш таго, зыходзіць з суверэнітэту беларускага народа. Горкія ўрокі мінулай нашай дзяржаўнасці патрабуюць прыняцця такіх мер.

І наогул настаў час адмовіцца ад аднабаковага разумення дзяржавы як апарату насілля, асаблівай дубінкі, машыны для падаўлення і г. д.

Тым не менш, канцэпцыя дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі, якой прытрымліваецца Старшыня Вярхоўнага Савета рэспублікі, не выключае ўваходжання яе ў састаў Саюза, хоць і на прынцыпова новых умовах: «Я спадзяюся, што мы зможам стварыць такі саюз нашых рэспублік, у якім яны будуць на самай справе раўнапраўнымі і суверэннымі. Я ўжо не гавару аб добраахвотнасці ўваходжання ў саюз. Іменна з добраахвотнасці трэба пачынаць стварэнне новага саюза. Працэдура выяўлення такой добраахвотнасці павінна выпрацоўвацца самой рэспублікай».

М. Дземянцей вельмі станоўча паставіўся да права выхаду саюзных рэспублік з саставу СССР. Прычым, лічыць ён, што не Саюз, а сама рэспубліка павінна вызначаць умовы і механізм свайго выхаду з саставу Саюза ССР — гэта вынікае з яе суверэнасці. Праўда, вызначаць гэтыя ўмовы рэспубліка павінна да ўступлення ў Саюз, бо яны могуць быць такія, што іншыя члены федэрацыі з імі і не згодзяцца. А стварэнне новага саюза суверэнных дзяржаў, падпісанне новага саюзнага дагавора магчыма толькі на аснове кансенсусу ўсіх суб'ектаў федэрацыі па ўсіх прынцыповых палажэннях гэтага дагавора.

Дэкларацыя аб суверэнітэце Беларусі, відаць, не будзе прынята Вярхоўным Саветам, але, падкрэсліў яго Старшыня, ад яе прыняцця становішча на нашым спажывецкім рынку, натуральна, адразу ж не палепшыцца. Але нельга ўсё-такі ўпускаць галоўнае. Атрымліваючы рэальную незалежнасць, мы адкрываем шлях да павышэння эфектыўнасці работы, бо атрымліваем сапраўдны статус гаспадара на сваёй зямлі. Мы ўсведамляем, што за нейкія хібы трэба адказваць самім, а не ківаць на цэнтр, у чым асобныя нашы кадры ўсіх узроўняў кіравання дасягнулі «вялікіх поспехаў». І, нарэшце, мы павінны разумець, што толькі ўласная праца, толькі ініцыятыва, прадпрымальнасць на любым участку работы, толькі найвышэйшая адказнасць кожнага дазволяць нам зрабіць сваё жыццё лепшым.

ДЛЯ СПАЖЫВЕЦКАГА РЫНКУ





Сёння, каб хоць як-небудзь аблягчыць цяжкую сітуацыю на спажывецкім рынку, тавары шырокага спажывання выпускаюць вельмі многія прадпрыемствы зусім іншага профілю. Так, напрыклад, на Мінскім электрамеханічным заводзе ў дадатак да сваёй асноўнай прадукцыі вырабляюць вязальныя пруткі, струнныя карнізы, дыванчысткі, дзіцячыя цацкі, радыёканструктары... Сёлета такой прадукцыі будзе адпраўлена пакупнікам на 15 мільёнаў рублёў Прадпрыемства ўзяло курс на асваенне тэхнічна складаных вырабаў. Ужо рыхтуюцца да выпуску блокі сілкавання для бытавой апаратуры і плеераў, апараты ультрагукавай тэрапіі, трэнажор дыхання «Рытм».

НА ЗДЫМКАХ: бесперабойную работу цэха тавараў народнага спажывання забяспечваюць старшы майстар Васілій ЛІПАТАЎ, дыспетчар Тамара МЕЛЕХАВА, старшы майстар Уладзімір ПРАХІРА; наборы для выпальвання «Гном» рыхтуюць да адпраўкі ў гандлёвую сетку Людміла ГАНЧАРУК і Зінаіда ЧЭПІКАВА.

Фота А. ТАЛОЧКІ.

РЭАЛІЗАЦЫЯ САЦЫЯЛЬНЫХ ПРАГРАМ НА ПРАМЫСЛОВЫМ ПРАДПРЫЕМСТВЕ

БЫЎ СТРАТНЫМ, СТАЎ ПРЫБЫТКОВЫМ

Эканоміка — найбольш хвалюючая сёння савецкае грамадства сфера жыцця. Развіццё яе ідзе вельмі супярэчліва. У прамысловасці, напрыклад, поруч з малаэфектыўнымі прадпрыемствамі, якія за час перабудовы прыйшлі ў яшчэ большы заняпад, існуюць і такія, што зрабілі ў апошнія гады істотны эканамічны скачок. Напрыклад, мінскі завод «Ударнік».

На пачатку і ў сярэдзіне 80-х ён не апраўдваў, мякка кажучы, сваёй гучнай назвы, узятай з прапагандысцкага лексікону сталінскага і брэжнеўскага перыядаў айчыннай гісторыі. Глыбокі крызіс ахапіў прадпрыемства. Амаль адсутнічала сацыяльнае будаўніцтва. І гэта пры тым, што прадукцыя «Ударніка» (ён выпускае дарожныя машыны) заўсёды карысталася вялікім попытам. Сярод прычын крызісу, як лічыць сёння пераважная большасць работнікаў завода, асноўнай была адсутнасць належнага гаспадарчага кіраўніцтва.

Тры гады назад у калектыў прыйшоў новы дырэктар Васіль Шлындзікаў. Ён за кароткі час кардынальна змяніў сітуацыю на прадпрыемстве і перш-наперш заняўся сацыяльнымі пытаннямі. Дзякуючы агульным намаганням, чарга на атрыманне жылля скарацілася да 2-3 гадоў. Гэта значае дасягненне. З навасельляў для многіх работнікаў прадпрыемства пачаўся, у прыватнасці, і сёлетні год.

Пры заводзе пачаў дзейнічаць пункт бытавых паслуг, дзе можна ўзяць напракат тэлевізар і халадзільнік, пілу і рубанак, нават невялікія станкі для некаторых работ. Значную палёгку для жанчын аказала адкрыццё тут пральні самаабслугоўвання. Пры вялікім дэфіцыце тавараў народнага спажывання работнікі завода, дзякуючы сістэме прамых дагавораў іх прадпрыемства з іншымі, адчуваюць таварны голад менш востра. Напрыклад, у мінулым годзе на «Ударніку» было размеркавана сярод працоўных каля 150 легкавых аўтамабіляў — па сённяшніх нашых мерках, значная колькасць на двухтысячны калектыў.

У калектыўным дагаворы, які штогод заключаецца паміж работнікамі завода і адміністрацыяй, на сёлетні год намечаны яшчэ цэлы шэраг сацыяльных мерапрыемстваў. Будзе прадоўжана будаўніцтва жылля. На прадпрыемстве ўступіць у эксплуатацыю сталовая з магазінам і сталом заказаў. У Адэскай вобласці на Украіне для завода будуецца база адпачынку. Намечаны і іншыя сацыяльныя мерапрыемствы, характэрныя для сённяшняга часу, якія палепшаць жыццё работнікаў прадпрыемства. Датычацца яны, у прыватнасці, увядзення розных ільгот па жыллёваму пытанню. Тут і пастаноўка на чаргу пры менш строгіх умовах, і выплата першага ўзносу за кааператыўную кватэру, і значная фінансавая дапамога пры будаўніцтве індывідуальных катэджаў. Закранулі гэтыя льготы ветэранаў працы, маладых спецыялістаў [illegible] рабочых, воінаў-інтэрнацыяналістаў, што [illegible]дзіліся ў Афганістане.

Дапамагаюць на заводзе шматдзетным сем'ям. Каб зменшыць цякучасць кадраў, штогод да агульнага заробку работніка будуць рабіцца трохпрацэнтныя налічэнні, якія назапашваюцца на ашчаднай кніжцы і да моманту выхаду чалавека на пенсію складуць істотную суму і зробяць [illegible]спечанай старасць кожнага члена калектыву.

Маштабная сацыяльная палітыка на прадпрыемстве стала магчымай дзякуючы ўдаламу прадпрымальніцтву кіраўніцтва завода, істотнаму росту прадукцыйнасці працы. Напрыклад, за мінулы год яе рост склаў 129 працэнтаў. У выніку значна выраслі за апошнія гады фонд матэрыяльнага заахвочвання работнікаў і фонд сацыяльнага развіцця. Калі апошні, напрыклад, у 1985 годзе складаў 33 рублі на чалавека, то ў 1989 годзе дасягнуў ужо 632 рублёў. Значыне, як бачыце, павелічэнне — амаль у 20 разоў.

Наперадзе завод чакаюць новыя перамены. У прыватнасці, ужо ў бліжэйшы час мяркуецца перайсці на арэнду. Гэта прагрэсіўная ступень у параўнанні з ранейшымі эканамічнымі мадэлямі. Мяркуючы ж па тым, што тут нядаўна выпушчана на 800 тысяч рублёў акцый, трэба чакаць, што з дзяржаўнага прадпрыемства «Ударнік» з цягам часу ператворыцца ў прадпрыемства акцыянернае, стане ўласнасцю працуючых тут людзей.

М. ДАШУК.

КАМП'ЮТЭРАЎ СТАНЕ БОЛЬШ

Чарговае сумеснае прадпрыемства з'явілася нядаўна на эканамічнай карце БССР. Яго ўтварылі Беларускае навукова-вытворчае аб'яднанне вылічальнай тэхнікі, індыйская фірма «Пірлес фабрыцэрн Індыя» і амерыканская «Вектар тэхналаджы груп».

Два гады назад Мінскае і Брэсцкае вытворчыя аб'яднанні вылічальнай тэхнікі, Навукова-даследчы інстытут электронных вылічальных машын зліліся ў Беларускае навукова-вытворчае аб'яднанне. Новае прадпрыемства ўзмацніла ўвагу да супрацоўніцтва з перадавымі замежнымі фірмамі.

— Створанае з нашым удзелам трайст[illegible] сумеснае прадпрыемства [illegible] першае ў СССР, нацэленае на масавую вытворчасць персанальных камп'ютэраў, — гаворыць генеральны дырэктар Беларускага навукова-вытворчага аб'яднання вылічальнай тэхнікі А. Тушынскі. — Яно да[illegible]е злучыць дастаткова в[illegible]окую кваліфікацыю нашых кадраў пры распрацоўцы і вырабе такіх элементаў ЭВМ, як корпус, блок сілкавання, і г. д. з адпавядаючай сусветнаму ўзроўню амерыкана-індыйскай канструкцыяй персанальных камп'ютэраў і тэхналогіяй іх вытворчасці.

Ужо сёлета сумеснае прадпрыемства павінна выпусціць 10 тысяч 16-разрадных персанальных камп'ютэраў, у наступным — 50 тысяч, а ў 1992 годзе — яшчэ ў два разы больш. У перспектыве размова ідзе таксама пра выраб бытавых, школьных і іншых персанальных ЭВМ, якія б, аднак, захоўвалі падабенства з прафесіянальнымі машынамі і таксама былі сумяшчальныя з камп'ютэрамі тыпу IBM. Для параўнання, у 1989 годзе Беларускае аб'яднанне вылічальнай тэхнікі выпусціла ўсяго каля 30 тысяч персанальных камп'ютэраў. Цяпер у Мінску ідзе падрыхтоўка вытворчых плошчаў для ўстаноўкі абсталявання, якое забяспечыць новыя тэхналогіі, абучэнне кадраў і г. д.

Мяркуецца, што ў першую чаргу персанальныя камп'ютэры сумеснай вытворчасці будуць рэалізаваны ў Беларусі. Як жа савецкі бок мяркуе разлічвацца з партнёрамі, у прыватнасці індыйскімі? Пошук адказу на пытанне — адна з важнейшых праблем, што стаіць перад сумесным прадпрыемствам. Плануецца, у прыватнасці, продаж часткі прадукцыі ў трэціх краінах. Намячаецца таксама сумесная вытворчасць электроннай бытавой тэхнікі. Разлікі будуць рабіцца прапарцыянальна ўкладу бакоў ва ўстаўны фонд прадпрыемства.

Сумеснае савецка-індыйска-амерыканскае прадпрыемства — не адзіны «калідор», па якому беларускія электроншчыкі супрацоўнічаюць з замежнымі калегамі. Напрыклад, сёлета ў Мінску будуць праходзіць міжнародны семінар і выстаўка Еўрапейскага інстытута пячатных плат. У Беларускім аб'яднанні вылічальнай тэхнікі арганізаваны дэманстрацыйны цэнтр, дзе выстаўлены розныя ўзоры персанальных камп'ютэраў і перыферыйных канструкцый да іх. Тут ствараецца таксама міжнародны цэнтр па гібрыднай тэхналогіі вытворчасці мікраэлементаў і пячатных плат, з гэтай мэтай тры спецыялісты аб'яднання ўжо адправіліся на адну з вядучых электронных фірм ФРГ.

У. БІБІКАЎ.

КАМАНДЗІРОЎКА ПА ПРОСЬБЕ ЗАМЕЖНЫХ СУАЙЧЫННІКАЎ

РУМ — КРАЙ, АД КАЛЫСКІ ДАРАГІ

Пажаданне Івана Васілеўскага, нашага суайчынніка з Аргенціны, данеслі ў рэдакцыю радкі з пісьма мінскага журналіста Ю. Высоцкага. Яго блізкія атрымалі ад аргенцінскіх сваякоў запрашэнне ў госці і, едучы ў правінцыю Місіёнэс транзітам цераз Буэнас-Айрэс, знайшлі ў сталіцы краіны гасцінны начлег у доме гэтага чалавека, выхадца з Валожыншчыны. І, як паведамлялі тыя радкі, «...успамінам пра далёкую пакінутую Радзіму не было канца. На развітанне Іван Васілеўскі вельмі прасіў, каб газета «Голас Радзімы», якую пастаянна чытаюць у Аргенціне ўсе беларусы, падрабязна расказала пра яго родную вёску Рум».

Улічваючы, што Івану Васілеўскаму не давялося яшчэ наведаць месца свайго нараджэння і дзяцінства, што перапіска румчан з ім па нейкіх прычынах перапынілася і што яны пры размове неаднаразова звярталіся да мяне: «Напішыце Васілеўскаму, напішыце...»,— я не бачу іншага журналісцкага рашэння. І пішу...

Паважаны Іван Пракопавіч!

Адзіны спосаб расказаць пра вашу родную вёску — паехаць туды. Што я і зрабіў чэрвеньскім днём, які трохі нервуе параменліва-капрызным, калі параметаеце, у гэтую пару надвор'ем. Мала супакойвае і барометр эканамічнага і палітычнага жыцця, ён паказвае «неспакойна, напружана, цяжка». Упэўнены, што пры размове ў нас з вамі ўзнікла б нямала адпаведных тэм і аналогій. Напрыклад, мадрыдскі прафесар эканомікі Хорхе Фансека ў іспанскай газеце «Эль Паіс» прадказвае Аргенціне шлях да голаду і фашызму. Ці не занадта змрочна?

Бліжэй да справы... Падзяліся вопытам на той выпадак, калі вы надумаеце наведаць Бацькаўшчыну: з Мінска ў Валожын ад сілы паўтары гадзіны язды на рэйсавым аўтобусе. У гэтым раённым цэнтры я зрабіў прыпынак, маючы намер зазірнуць у краязнаўчы музей, каб «падказвацца» навукова. Лагічна, што ў прышлага чалавека ўжо адна лаканічная і прыгожая назва «Рум» выклікае цікавасць. Якое яе паходжанне? На жаль, аказалася, што ў адзінаццацітысячным гарадку такога музея не існуе. (Думаю, стварыць яго трэба неадкладна, пакуль не парвалася ніць пераемнасці пакаленняў, беларускай культурнай спадчыны). Аднак тамашнія інтэлігенты знайшлі-такі для мяне этнаграфічны матэрыял, нешта накшталт падання: «Гаварылі старыя так: якая-то прыстань была тут. Па Іслачы ганялі ўверх віціны. Тут спыняліся. Прыстань назвалі Забаль-порт. Можа таму, што балявалі ў карчме. На беразе складвалі ў шляхты сплаўны лес. Тут жа яго прадавалі і адсюль адпраўлялі. Пазней прыстань назвалі «Рум».

Дапускаю, што ў маленстве і вы маглі чуць гэтае паданне. А вось той брук, даўжынёю чатырнаццаць кіламетраў, што цягнуўся з Рума ў Валожын паміж балотаў, па якім вы ў 1937 пачыналі сваю пуцявіну са старога заходнебеларускага свету ў новы аргенцінскі, павінен вам выразна прыгадацца. Мой жа шлях у ваш бацькоўскі кут, кірункам таго ж бруку, але ўжо па новай аўтастрадзе, заняў менш дваццаці хвілін. (Бачыце, вы маеце дакладны падлік часу, мала што ні храніметраж...).

Паабапал шашы — аксамітная роўнядзь сенажаці, якая заканчвалася сінявата-чорнай сцяной лесу. Як мне падалося пасля гарадской мітусні і шаленства руху, наўкола панаваў так

[Заканчэнне на 4-й стар.].

СТАРОНКІ МІНУЛАГА

СЛАВУТЫЯ АДВАГАЙ НА ВАЙНЕ

Асабліва зненавідзелі крыжакі мужнага военачальніка, непераможнага Давыда Гарадзенскага. Адно яго імя наганяла жах на святых рабаўнікоў. У 1314 годзе, напрыклад, Давід Гарадзенскі разграміў крыжакоў каля Навагрудка, калі яны аблажылі і марна спрабавалі ўзяць замак. Некалькі разоў пляжыў ён ордэнцаў у 1318—1319 гадах на тэрыторыі Беларусі і за яе межамі, у тым ліку ў самым логаве тэўтонцаў —у Прусіі. У 1323 годзе дапамог Пскову разбіць нямецкіх і дацкіх рыцараў ля сцен горада і за Наровай-ракой. Затым правеў удалы паход у Мазовію, а ў 1326 годзе — у Брандэнбург, дзе і загінуў ад подлай рукі мазавецкага рыцара Андрэя, падасланага святымі братамі, вялікімі майстрамі розных інтрыг і забойстваў.

Крыжакамі маткі палохалі непаслухмяных дзяцей, а іхні крыж у чорнай барве на белых і шэрых плашчах быў сімвалам вайны, рабунку, смерці. Амаль два стагоддзі трывала смяротнае супрацьстаянне Вялікага княства Літоўскага з зацятым агрэсарам, якому дапамагала матэрыяльна, маральна і жывой сілай уся Еўропа, у тым ліку такія магутныя дзяржавы, як Англія і Іспанія. Захопніцкая палітыка Тэўтонскага ордэна, які, дарэчы, быў створаны па патрабаванню рымскага папы Рыгора IX, перад усім светам выстаўлялася ў якасці місіянерскай, богаўгоднай справы далучэння дзікіх язычнікаў да хрысціянства. А што беларусы і ўкраінцы ўжо даўно не былі язычнікамі і з 988 года вызнавалі вучэнне Хрыста, крыжакоў мала непакоіла. Яны проста абвясцілі ўсіх праваслаўных схізматамі і недаверкамі. Прасцей простага: навесіў бірку і як хочаш шкуматай суседа...

А тым часам барацьба працягвалася: адны клалі душы за сваю зямлю, другія ажыццяўлялі стварэнне за кошт чужых тэрыторый вялікай тэўтонскай дзяржавы. Існаваў рэальны план будаўніцтва Вялікай Тэўтоніі ў межах ад вострава Ругена да Фінскай затокі з уключэннем у яе паўночнай Польшчы, Літвы, Беларусі, Пскоўшчыны і ўладанняў Вялікага Ноўгарада. Сёння цяжка нават уявіць, якога звышчалавечага высілку трэба было пакласці, каб на працягу без малога двухсотгадовага перыяду стрымліваць рух вогненнага валу на Усход. Нашым прашчурам на працягу ўсяго гэтага часу даводзілася штогод у сярэднім да дзесяці разоў брацца за зброю, а дакладней, ніколі не выпускаць яе з рук. І гэты подзвіг беларусаў дагэтуль не ацэнены і не асветлены належным чынам.

Не трэба быць асабліва прадбачлівым, каб зразумець, што, стварыўшы Вялікую Тэўтонію і ўкараніўшыся ў яе межах, крыжакі не ўтаймавалі б сваіх апетытаў. Такая псіхалогія каланізатараў. І гэта неаднойчы пацверджана гісторыяй. Раней ці пазней крыжакі падмялі б пад сябе і рускія княствы, у тым ліку і Маскоўскае. На гэтым усходнія славяне, падобна люцічам і бодрычам, прусам і борцям і іншым славянскім супольнасцям, назаўжды зніклі б з гістарычнай арэны. Рэальнасць такой перспектывы пацвярджаецца і тым, шт[illegible] тэўтонцы ў адрозненне ад т[illegible]-манголаў, якія не выкаран[illegible] народнай культуры, у тым ліку і рэлігію, апошнюю нават падтрымлівалі, праводзілі мэтанакіраваны татальны этнічны генацыд. На захопленых тэрыторыях яны, як правіла, знішча[illegible]датных да супраціўлення, астатніх цераз сістэму каталіцкай царквы і асветы, адміністрацыйныя органы і прымус актыўна анямечвалі.

Нельга ў гэтай сувязі не спамянуць некалі магутнае славянскае родаплемяннае аб'яднанне радараў, што жылі паміж Сярэдняй Лабай (Эльба) і Ніжняй Одрай (Одэр). Дзе яны цяпер і хто пра іх, акрамя лічаных гісторыкаў, ведае? Толькі невялічкая купка радараў, напэўна, некалькі патранімічных груп, падаліся ў пошуках ратунку на Усход і аселі на тэрыторыі сучаснай Беларусі. З прычыны малалікасці і роднасна па звычаях і мове асяроддзя яны хутка асімілявaліся з мясцовым насельніцтвам, а праз некалькі пакаленняў страцілі нават памяць аб сваім паходжанні. Адзіным цьмяным напамінкам аб радарах засталіся вёскі Радагошч у Янаўскім і Навагрудскім раёнах, названых некалі ўцекачамі на ўспамін пра сваю зруйнаваную немцамі ў 1068 годзе аднайменную сталіцу. Такі ж трагічны лёс спасціг і тую нешматлікую частку балцкіх плямёнаў прусаў і борцяў, якія таксама знайшлі збавенне ад крыжацкага нашэсця на Беларусі. Сюды, бароначыся ад той жа напасці, апошні яцвяжскі князь Скурдо прывёў рэштку сваёй дружыны з жонкамі і дзецьмі. Магчыма, адсюль і пайшла вёска Яцвязь непадалёку ад возера Свіцязь.

У крытычным становішчы са з'яўленнем крыжакоў апынулася і Польшча. Палітыка ўлагоджвання ордэнцаў, якую праводзілі некаторыя польскія князі і пераважная большасць біскупаў, крок за крокам падводзіла дзяржаву, яе насельніцтва да страты этнічнага аблічча. Выкарыстоўваючы разнастайныя сродкі падпарадкавання, немцы метадычна праводзілі палітыку занявольвання і анямечвання палякаў. Польшча паступова страчвала свае землі на захадзе і поўначы, а ў 1343 годзе ў поўнае ўладанне немцаў перайшло Гданьскае Памор'е, што адрэзала палякаў ад Балтыйскага мора.

Адначасова інтэнсіўна адбывалася нямецкая каланізацыя Польшчы, так сказаць, мірным шляхам. Не толькі гарады, але і вёскі навадняюць перасяленцы з унутраных раёнаў Нямеччыны. Яны хутка наладжваюць кантроль над асноўнымі галінамі эканомікі, займаюць вядучыя пазіцыі ў кіраўніцтве гарадоў, вярхі якіх цалкам складаліся з немцаў і анямечаных палякаў. Над краінай навіс дамоклаў меч дэнацыяналізацыі і, як яе лагічнае завяршэнне, страты дзяржаўнасці.

Трагічнасць этнічнай сітуацы[illegible]ладнялася і тым, што на по[illegible]м троне з 1370 года сядзеў негатыўна настроены да ўсяго польскага немец Людовік Анжуйскі, бацька каралеўны Ядвігі. А з 1380 года па даручэнню караля Польшчай правіў яго зя[illegible] Сігізмунд Люксембургскі, будучы нямецкі манарх і рымскі імператар. Па характарыстыцы польскіх гісторыкаў, ён нават не хаваў сваю «непрыхільнасць да палякаў і сімпатыю да крыжакоў». Ядвіга, выхаваная ў нямецкім духу пры венскім двары, чулася больш немкай, чым полькай. Да ўсяго, яна яшчэ ў чатырохгадовым узросце была абвенчана 15 чэрвеня 1378 года ў Гайнбургу з Вільгельмам Аўстрыйскім з умовай, што шлюб набудзе юрыдычную моц пасля кансумацыі, інакш кажучы, з моманту першай шлюбнай ночы, пачатак якой быў звязаны з дасягненнем ёю ў лютым 1386 года дванаццацігадовага ўзросту.

Усё ішло да таго, каб дынастычны шлюб Ядвігі стаўся чорнай вяхой на гістарычнай арбіце польскага народа, паваротным пунктам да страты нацыянальнага аблічча, бо, як толькі Вільгельм атрымліваў карону, Польшча фактычна пераходзіла ва ўласнасць Габсбургаў. Але ў гісторыі народаў, як і ў жыцці асобнага чалавека, бываюць нечаканыя павароты. «Бяспрыкладнае ў гісторыі шчасце, як трапна заўважыў у 1890 годзе гісторык І. Філевіч, зазззяла на змрочным польскім даляглядзе».

Знайшліся прадбачлівыя феадалы і цвярозыя біскупы, якія своечасова спахапіліся і змаглі папярэдзіць трагедыю. У пошуках выйсця яны спыніліся на скасаванні ўсіх адносін з Габсбургамі і заключэнні саюза са сваім нядаўнім ворагам — Вялікім княствам Літоўскім. Ажыццявіць гэтую ідэю было нялёгка. Сярод уплывовых колаў Кракава, тагачаснай сталіцы Польшчы, існавала даволі значная апазіцыя з прыхільнікаў заходняй арыентацыі. Варожыя адносіны да збліжэння з усходнім суседам добра праглядваюцца праз прызму стаўлення пэўнай часткі польскай арыстакратыі да асобы самога Заразлі бульнягом надворкі:

Станіслаў ЦЯРОХІН.

Працяг. Пачатак у № 28.

РУМ—КРАЙ, АД КАЛЫСКІ ДАРАГІ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

спакой і ўсяленская гармонія, што я мала што ні чуў, як Іслач, вельмі абмяльчэлая ў параўнанні з даваенным часам, журчала ў хмызах халодным струменем плыні. Ля першых хат вёскі — гняздо буслоў на электрычным слупе, дзе бацяны якраз кармілі маладняк. Рухавая бабулька пераганяла наўскос вуліцы рахманага парсюка, ласкава пляскаючы па яго тлустых кумпяках... хакейнай клюшкай. І да болю хацелася, каб нішто не пэцкала чорнай фарбай гэтыя блакітныя, амаль што пастаральныя эскізы, якія я вам малюю... Кажуць людзі, што там, дзе жывуць буслы і пяе жаўрук, няма радыяцыі... Ды птаства, што беларускі чалавек, даверлівае, без хітрыкаў, бездапаможнае... 40 працэнтаў жыхароў Валожыншчыны жыве на забруджанай радыенуклідамі тэрыторыі. Звыш 70 населеных пунктаў паказваюць забруджанасць звыш 1 кюры на квадратны кіламетр, а ў такіх сёлах, як Рацькі, Сівіца, пасёлку Першаі і некаторых іншых, ад 5 да 15. Дзе былы Забаль-порт, а дзе Чарнобыль! Аднак раз'юшаны «мірны» атам, аблада чалавечай неахайнасці і злачынства, да якой беларускі народ — ні сном, ні духам,— дапяў і сюды. Праўда, Рум — чыстая ад яго прысутнасці мясцовасць. Аднасна чыстая, бо няма ў рэспубліцы ні гарадоў, ні вёсак, адкуль бы не патражала радыяцыйнае апраменьванне самымі малымі сваімі дозамі. І ніхто не ведае, як яны ўплываюць на стан здароўя жывой істоты. Правільней кажучы, як хутка адымаюць яго ў яе...

Вядома, гэтая складаная «ядзерная» тэрміналогія — кітайская грамата для аргенцінскіх беларусаў (якое шчасце!) і, магчыма, не трэба было мне рабіць на гэтым акцэнт. Але ў Руме ў мяне пыталіся людзі, а як нашы землякі ў Аргенціне ставяцца да чарнобыльскай катастрофы. Я адказаў, што, безумоўна, шкадуюць нас... Больш канкрэтнага з берагоў Ла-Платы нічога не чуваць. І выказвалася сумненне, якое і я падзяляю: верагодна, што інфармацыя аб трагічных выніках Чарнобыля не дайшла да вас. Гэта так, Іван Пракопавіч?

...Першым, хто мяне спаткаў у вашым родным кутку, была Васіліса Сямёнаўна Грабоўская, ці проста бабка Васіліса. Яна памятае Васілеўскага, што калісьці ад'ехаў на заробіткі ў «Амэрыку». Калісьці — значыць «пры Польшчы», калі «калоды» з лесу для графа Тышкевіча вазілі, у курных хатках крупы ў жорнах малолі. Не верыцца ёй, што так жылося тады, хоць і потым ўсялякага хапала... А сённяшнюю дэмакратызацыю бабка Васіліса вітае. Асабліва тое, што можна свабодна верыць у бога. «Цяперака час іншы, час пакаяцца»,— сказала яна мне.

Хачу шчыра прызнацца: першыя роспыты вашых колішніх аднавяскоўцаў нечакана завялі мяне ў тупік. І я так і не здолеў разабрацца і высветліць, дзе ёсць ваш брат Уладзімір, а дзе вы. Ці вы разам эмігрыравалі ў Паўднёвую Амерыку, ці пасобку? Нават Марыя Васілеўская, якая жыла ў адной з вамі хаце, нават маючы старыя фотакарткі, чамусьці памятае толькі вашага брата. Я знаходжу некалькі прычын, што прывялі да гэтай сітуацыі. Колькі вады перанесла з тае пары Іслач! Ці дзіва, што многае забылася. Да таго ж, генеалагічнае дрэва роду Васілеўскіх, відаць, мае вельмі разложыстую крону, мяркуючы па распаўсюджанасці прозвішча ў вёсцы. Як усіх прыпомніць...

Бяды вялікай у такой трохі заблытанай сітуацыі няма: вы сам, чытаючы маё пасланне, расставіце ўсё па сваіх месцах. Да гэтае высновы я прыйшоў не адзін, а ў кампаніі з Фёдарам Дзям'янавічам Васілеўскім, вашым дваюрадным братам і яго жонкай Кацярынай Феліксаўнай. Абое знаходзяцца на пенсіі, маюць дзвюх дачок, сына і чатырох унукаў.

Аказалася, што і Фёдару Дзям'янавічу наканавана было пажыць на чужыне. У 1942 фашысты зрабілі аблаву і шмат каго з Рума, у першую чаргу моладзь, пагналі на катаржныя работы ў Германію. Шасцёра хлопцаў-нявольнікаў з Рума, у іх ліку і Фёдар Дзям'янавіч, трапілі ў лагер ля горада Штайнмарка. Тры гады знаходжання ў ім і невыносная праца на будаўніцтве здаліся векам пакут. Трываць далей не хапала сілы, і «остарбайтэр» пад нумарам 50, ён жа Фёдар Васілеўскі, уцякае з катаргі. Дыхаў паветрам свабоды нядоўга: паліцыя хутка арыштавала ўцекача. Але назад не адправіла, і да вызвалення амерыканцамі ён працаваў у «баўэра». Затым вярнуўся дахаты, нажыўшы ў блуканнях іншаземнае «багацце»: лагерную лыжку нумар 50, якую цяпер беражліва захоўвае ўнук.

Так, вайна навечна застанецца ў душах і сэрцах вашых землякоў. Загінула на франтах другой сусветнай многа вашых аднагодкаў і, мабыць, сябрукоў. У іх гонар стаіць у вёсцы Белакорац абеліск, на ім прозвішчы Васілеўскага Васіля Юстынавіча, Васілеўскага Івана Дзям'янавіча, Уладзіміра і Фадзея Бацянаў, Язэпа Уласіка і іншых.

Наўрад ці вы знайшлі б у вёсцы знаёмыя абрысы, пабудовы, якія засталіся ў карціны мінулага. За сувязь з партызанамі гітлераўцы вынеслі смяротны прысуд Руму — спалілі датла. Адваяваўшы, аплакваючы ахвяры, сяльчане збудавалі на папялішчах новую вёску. Не скажаш, што яна выглядае маленькай: каля сотні двароў налічыце. Але частка іх пазірае на свет вокнамі пустога жытла. Заразлі быльнягом надворкі: хтосьці з жыхароў воляю лёсу выбраўся пад крыжы старых могілкаў, а хтосьці пераехаў у горад. Старэе Рум... Хоць і працуе ў ім малочна-таварная ферма на 200 галоў рагатай жывёлы, ёсць невялікі клуб, камунальна-бытавыя паслугі.

Рум у застойныя гады аднеслі ў шэрагу многіх да «неперспектыўных»... Я наогул не разумею, як вёска, вялікая ці малая, можа быць неперспектыўнай. Як сказаць бабулі з хакейнай клюшкай, што яе свінчо «пазбаўлена перспектывы», калі і стратэгі аграрнай навукі, і практыкі, і калгаснікі, і іхнія нашчадкі будуць яшчэ доўга-доўга смажыць сала на патэльні... і есці з бульбаю ўсмак.

Ёсць і аб'ектыўныя моманты, што тлумачаць зыход сельскага люду з зямлі. Такая агламерацыя, як амаль двухмільённы цэнтр вобласці і рэспублікі Мінск, ды і раённы Валожын, плюс прамысловы бум патрабавалі, прапануючы лепшыя сацыяльна-культурныя варункі, прытоку працоўных рэсурсаў з сяла. А што датычыць вашай вёскі, то яе сельскі Савет і праўленне калгаса імя У. І. Леніна, у складзе якога знаходзіцца Рум, размешчаны непасрэдна ў Валожыне. Калгас мае там дробнае прадпрыемства, дзве «уласныя» вуліцы, гасцініцу. 400 чалавек, жывучы ў гэтай гаспадарцы, працуюць на прадпрыемствах індустрыі. Тут ёсць і прагрэсіўны момант. Адыгрывае вялікую ролю і геаграфічнае становішча калгасных палеткаў, якія зрошчваюцца з гарадскімі ўскраінамі. Але вёска старэе... Сярэдні ўзрост калгаснікаў 49 гадоў.

Як я разумею, Іван Пракопавіч, не найлепшыя праявы нашай цывілізацыі, хуткасная ўрбанізацыя і гіпертрафія цэнтра адносна перыферыі характэрны і для вашай прыёмнай радзімы. Згодна са статыстыкай, у Буэнас-Айрэсе жыве аж трыццаць працэнтаў насельніцтва Аргенціны. Чытаў я, праўда, што аргенцінцам удаецца ўзяць пад кантроль памянёныя працэсы. Якім чынам?

Няма ў мяне сумнення, што і Рум пераважыве ўсе цяжкасці. Залог таму — адраджэнне народам састаўных частак яе жыцця, вялікія перамены ў нашым грамадстве. Аднак лепей адзін раз убачыць... Што і прапаную вам зрабіць землякі і сваякі, ад якіх я і перадаю прывітанне. І чакаю ад вас адказу на мае пытанні.

З павагаю да вас

Кастусь ШАЛЯСТОВІЧ.

РУХ И БУДУЩЕЕ УКРАИНЫ

ПОЧЕМУ ОНИ ПРИШЛИ К ВЛАСТИ

По результатам выборов в местные органы власти хозяевами многих Советов в Западной Украине стали представители набравшего силу в последнее время Народного движения Украины за перестройку — Руха, объединяющего различные общественные течения: от молодых радикалов, верующих вчера еще запрещенной украинской греко-католической церкви или «зеленых» — до коммунистов. Например, положенная Львовщине квота — 24 мандата в Верховный Совет Украины — полностью отдана избирателями кандидатам Руха.

Сегодня часто приходится слышать от тех, кто пребывал у власти в условиях многолетнего политического комфорта: «Почему они пришли к власти? Какие ошибки совершили мы?»

Чтобы лучше понять, почему «они» пришли к власти, надо вернуться к историческим истокам сегодняшних событий: к никогда не ослабевавшей доминанте духовной жизни Украины — идее национального возрождения. Ее политический смысл с четкостью и ясностью изложил в начале нынешнего века в наброске «Украинский вопрос и русское общество» великий русский ученый В. Вернадский: «Опасность... не в украинском движении, как таковом, а в предвзятой трактовке его в качестве вредного и притом наносного явления в государственном и национальном организме. При таком взгляде движение, по существу естественное, органическое и имеющее равное парво на существование со всеми аналогичными движениями, отодвигается в ряды бесправных, а потому враждебных данному государственному укладу явлений».

Для каждого, кто может непосредственно наблюдать сегодняшнюю политическую ситуацию на Украине, от этих мыслей веет живыми настроениями дня.

А теперь предоставим слово первому секретарю Львовского горкома Компартии Украины В. Волкову:

— Причины нашего поражения на выборах объясняются прежде всего кризисным состоянием общества и специфическими местными условиями, обострившими ситуацию. Это, во-первых, негативное отношение к нашей партии как к опорной конструкции командно - административной системы, сдерживавшей социально-экономическое и культурное развитие республики и страны. Во-вторых, нам, нынешнему поколению коммунистов, пришлось платить по счету за все страдания, которые пережило местное население в годы сталинизма и застоя: за репрессии 1939-1941 годов и послевоенных лет, депортации, насильственную коллективизацию, пренебрежение к религиозным традициям, историческим памятникам.

Достаточно вспомнить недавнее наше сопротивление первым попыткам создать Общество украинского языка им. Шевченко. Не в этом ли главная причина политизации этого движения, которое стало первой организационной структурой будущего демократического блока, победившего на выборах? В марте прошлого года пленум горкома партии принял ошибочное решение о недопустимости участия коммунистов в создании первичных ячеек Руха, и это оттолкнуло от нас многих львовян. Позднее оно было отменено, но возможности политического влияния на это массовое движение были упущены.

С опозданием начали мы отказываться от предубеждений по отношению к национальной символике, «белым пятнам» истории края, вопросам реабилитации незаконно репрессированных в годы сталинщины и более поздний период. Взять, например, отношение властей к группе «узников совести», осужденных в 60-70-е годы за взгляды, которые сегодня может свободно высказывать любой. Это нынешний председатель Львовского областного Совета и народный депутат Украины Вячеслав Чорновил, его товарищи по тюрьмам и коллеги по Верховному Совету Украины Михаил и Богдан Горыни, Ирина Калинец, Степан Хмара, депутаты областного Совета Игорь Калинец и заместитель Чорновила Иван Гель. Они выражали свое несогла[illegible] с официальной идеоло[illegible]ей, били тревогу по поводу упадка национальной культуры. Власти расценили это как опасный рецидив буржуазного национализма и сепаратизма.


Мы не воспользовал[illegible] ленинскими советами о необходимости и полезности компромиссов, о поиске союзников. Наоборот, своими действиями мы сделали все для самоизоляции, оттолкнули от себя самодеятельные, общественные организации. Отсутствие четких позиций по проблеме восстановления в правах украинской греко-католической церкви привело нас к потере доверия как греко-католиков, так и православных. Результатом таких и других ошибок и явилось отсутствие поддержки масс и наше поражение на выборах...

И, наконец, позиция другого львовянина, народного депутата Украины, академика И. Юхновского, бывшего одним из претендентов на пост Председателя Верховного Совета республики:

— Имеет место не только катастрофическое загрязнение окружающей среды, но и мысли человеческой. Люди ищут спасения. Оно невозможно под старыми знаменами... И потому не удивляйтесь, что люди ищут свое историческое знамя, и не мешайте этому. Мы должны построить суверенную Украинскую республику, заключить новый Союзный договор. За всю историю нашего народа еще ни перед одним народным парламентом не стояла такая большая задача...

Этим словам, произнесенным тихим голосом человека, не привыкшего к высоким трибунам, единодушно аплодировал весь новый, сотрясаемый политическими страстями и бурями парламент Украины.

Александр ГУРЕВИЧ.



Край родной. Фотоэтюд **В. АЛЕШКЕВИЧА.**

ИМЕНА, ИЗВЕСТНЫЕ ВСЕМ

АВАНСЫ И ДОЛГИ

Про Николая Шмелева можно сказать: он дождался своего часа. Только в условиях начавшейся в 1985 году перестройки советского общества могла появиться его звезда. Вышедшие вслед за первыми экономическими публикациями художественные повести и рассказы подтвердили его право на роль одного из ведущих экономистов СССР и одного из интересных современных писателей.

Особенно ярко его звезда засияла в 1987 году, когда он, уже перешагнувший пятидесятилетний рубеж, решительно заявил о себе двумя программными публикациями. Статьей «Авансы и долги», в которой ученый-экономист развеивал последние иллюзии о жизнеспособности экономической системы страны с командно-административными методами хозяйствования и предлагал конкретные, хотя и экстраординарные меры по выходу из тупика. И повестью «Пашков дом», утверждавшей приоритет культуры в системе общечеловеческих ценностей.

Пашков дом — неофициальное название одного из красивейших зданий Москвы, ныне Государственной публичной библиотеки имени В. И. Ленина. В повести этот дом предстает символом интеллектуального убежища для героя, «альтер эго» самого автора, человека, страдающего от мерзости окружающей жизни, от необходимости подчиняться ее законам, зачастую далеким от нравственного совершенства.

Как специалист, ученый Шмелев — сторонник открытой экономической системы, опирающейся на рыночные отношения, подчиняющейся исключительно экономическим законам. И в этом он отнюдь не революционер: «Не придумывать что-то небывалое, вымученное, искусственное и потому обреченное на гибель уже при рождении своем, — призывает он руководителей государства, — о в л а д е т ь тем, что сама жизнь придумала за нас за тысячи лет развития человечества...»

Его статьи написаны ясно и просто, с той энергической страстью, которая позволяет увидеть в нем человека, искренне переживающего за судьбы страны, народа, желающего изменить сложившееся положение. Они воспринимаются как увлекательное чтение. Его имя на устах у всех. Многие с ним не соглашаются, но от его доводов невозможно отмахнуться: настолько они мотивированы и убедительны.

Ученый не устает призывать своих сограждан к здравому смыслу. Став вопреки воле консервативной части избирателей народным депутатом СССР, он воспользовался парламентской трибуной, чтобы еще более эффективно отстаивать свои взгляды, утверждая идеи рынка и всего, что с ними связано. Голос тихий, спокойный (думаю, от сдерживаемой силы), интеллигентный, но к нему прислушиваются, его слышат.

Шмелеву-писателю требуется, по его собственному признанию, только одно — чтобы его два час[illegible] по утрам не беспокоили, [illegible] возможность углубиться [illegible]мир своих интеллектуальных фантазий. Герои всех его произведений — интеллигенты. Потому что он знает их лучше других: их поиск смысла жизни, раздумья о судьбах на[illegible]в, сам образ существова[illegible]. Сын инженера-геодезиста и медицинской сестры, Шмелев прошел, в общем-то, благополучный внешне путь: московская школа, Московский университет, успешная научная карьера, столичная среда интеллигенции, та среда, без которой общество, считает писатель, было бы мертво. Ведь он не связывает с понятием интеллигентности некую рафинированность мысли и чувства. Его герои, как и его окружение, люди сугубо «земные».

И в науке, и в литературе Николай Шмелев предпочитает модели, ситуации, характеры, максимально приближенные к реальности, к действительности. И в то же время он не прагматик, его привлекают коллизии высокого интеллектуального накала.

Одна из самых популярных его вещей — повесть «Спектакль в честь господина первого министра» — характерный шее для творчества этого писателя произведение. Проникая в духовный мир великого поэта Германии Иоганна Вольфганга Гете, автор показывает его в момент крушения надежд на утверждение справедливости в государстве, в котором силой обстоятельств поэт стал премьер-министром.

Взаимоотношения силы и творчества, личности и власти, возможность гармонии между ними — вот, похоже, то основное, что волнует сегодня писателя Николая Шмелева, вот в чем он пытается разобраться, будь то наши современники или люди, давно ставшие достоянием истории.

Сейчас писатель завершил работу над новым романом. Действие его разворачивается в XVI веке, в эпоху Ивана Грозного, русского царя, прославившегося своим умом и своей жестокостью. В центре повествования подлинная историческая фигура — поп Сильвестр, один из авторов (а может, и единственный автор, история об этом умалчивает!) знаменитого «Домостроя», своеобразного устава русского быта, книги, на несколько столетий определившей нормы и правила, самобытные устои жизни русского народа.

И опять, как и в «Спектакле для господина первого министра», столкновение Личности и Власти, творческого начала и расчета на грубую силу. Поп Сильвестр был другом и наставником молодого царя. Его советы, разумные и дальновидные, во многом способствовали укреплению царской власти, утверждению спокойствия и мира на русской земле. Но как только Иван Грозный, опьяненный властью, пренебрег советами своего интеллигентного наставника, в частности развязал губительные Ливонские войны, а Сильвестр попытался противоречить, то он был сослан в знаменитые уже тогда Соловки, а затем и вовсе вычеркнут из жизни. Безумный царь буквально растоптал своего бывшего друга, превосходившего его мудростью и талантом...

Русская история, по мнению Николая Шмелева, есть непрерывная борьба Личности и Власти, вернее, есть непрерывная цепь поражений Личности в борьбе с Властью. Печальное открытие, и звучание его предельно современно. История четырехсотлетней давности, ожившая под пером писателя, всего лишь один из эпизодов этой многовековой борьбы, принявшей сегодня особенно трагические формы.

Позиция Николая Шмелева — позиция ученого-экономиста, писателя, общественного деятеля, народного депутата, одного из лидеров коренной перестройки, отчетливо просматривается и в его многочисленных афористических высказываниях:

«Мы попали в полосу нового средневековья...»

«Мы создали чудовище, нелепую экономическую систему...»

«Прогноз перестройки — вопрос веры в ее идеалы...»

«За годы вранья, годы маразма в общественной жизни мы забыли литературное ремесло...» И последнее:

«Литература — душа человеческая...»

— Я взываю к здравому смыслу, — говорит депутат Николай Шмелев.

— Я хочу понять жизнь, — говорит писатель Шмелев.

Эдуард БРАНДЕС.
(АПН).

ГОСЦЬ БЕЛАРУСІ—ТАНЦАВАЛЬНЫ ГУРТОК «ВАСІЛЁК» З АМЕРЫКІ

МАЛІТВА ЗА ЗЯМЛЮ ПРОДКАЎ

II. ДАВАЙЦЕ ЗНАЁМІЦЦА БЛІЖЭЙ

З «Васільком» я ўпершыню пазнаёмілася летась, калі ездзіла ў Беласток па запрашэнню газеты «Ніва». Некалькі разоў бачыла там выступленні гуртка, нават гутарыла з некаторымі яго ўдзельнікамі. Аднак знаёмства тое было кароткае, надта павярхоўнае. Успрынялі мяне тады з нейкай насцярожанасцю... Маўляў, чаго яна хоча, журналістка з газеты, з якой мы далёка не ў сяброўскіх адносінах. Скарысталі і нагоду — выказалі свае адносіны, праўда, у даволі дыпламатычнай форме.

У Мінску ж мы з раніцы і да ночы разам. Ніхто мяне, праўда, не прымушае так працаваць. Гэта ўжо асабістыя прынцыпы работы. Проста хочацца ўбачыць, якія яны людзі, як успрымаюць тыя ці іншыя рэчы, як рэагуюць на нашу рэчаіснасць, што думаюць у тых ці іншых выпадках.

Па першым часе я старалася мала гаварыць з імі. Хіба што толькі з Алай Орса-Рамана. З самага пачатку паважаны прафесар прапануе перайсці на «ты», але ў мяне гэта не атрымліваецца. З Алай увогуле лёгка — яна чалавек надзвычай дэмакратычны, непасрэдны. Калі ўжо і ёсць нешта на душы цяжкае, то скажа, не будзе трымаць камень за пазухай. Як аднойчы:

— Крыўдна бывае, што часам прыязджаюць да нас у Амерыку адсюль, з Беларусі, а ні слоўца сказаць не могуць на сваёй мове, нават не прызнаюцца, што беларусы. А мы ж усім там гаворым, што Радзіма наша — найпрыгажэйшая і людзі ў Беларусі — таленавітыя, працавітыя. Хіба паверыць тады хто, што гэта так і ёсць, хутчэй, што эмігранты ўсё папрыдумлялі і няма ніякай Беларусі. Але ж яна ёсць, жыве Беларусь! Гэта мы ўбачылі, як прыехалі. І тут зараз столькі ўсялякіх падзей...

Усю сваю «каманду» — 17 «амерыканцаў» і 6 прадстаўнікоў Беларускага аб'яднання студэнтаў у Беластоку (БАС), з якімі «Васілёк» падтрымлівае сяброўскія сувязі і якія таксама былі запрошаны таварыствам «Радзіма», яна з лёгкасцю гуртуе ў адзін калектыў.

— Мае вы коцікі, у нас тут ніхто нікога не прымушае, — прыгадваю я яе ранішнюю прамову ў аўтобусе, калі доўга не маглі ўсе сабрацца і спазняліся на запланаваную экскурсію, — кожны мусіць сам за сябе адказваць.

...Напярэдадні першага канцэрта ў сталіцы нашыя госці разам з Дзяржаўным ансамблем народнай музыкі «Жывіца» (з салістамі гэтага калектыву — заслужанай артысткай рэспублікі Валянцінай Пархоменка і Аляксандрам Казаком А. Орса-Рамана сустрэлася мінулым годам у Нью-Йорку, а пазней і дамовілася на сумесныя выступленні ў Беларусі) сабраліся на рэпетыцыю. Сцэна — тая самая, дзе менш чым год назад з трыумфам выступаў Данчык. Але Данчыку, думаецца, было ўсё ж трохі прасцей. А тут трэба аб'яднаць у адной праграме два зусім розныя калектывы. Акрамя гэтага, у «Васілька» няма свайго акампаніятара. Выконваць такую ролю згадзіўся мінскі музыкант Фёдар Паўлавец.

...Быццам і няёмка знаходзіцца зараз у зале, быць, так сказаць, назіральнікам таго, як у муках нараджаецца праграма гэтага незвычайнага канцэрта. За два дні сумесных паездак я ўжо ведаю, як кожнага завуць, хто з іх чым займаецца ў сваёй далёкай Амерыцы і нават які ў каго характар. Вось, напрыклад, два сыны Алы Орса-Рамана—Павал і Коля. Знешне такія розныя. Павал—чарнавалосы, з чорнымі жывымі вачамі. Тэмперамент не дазваляе яму доўга сядзець — увесь час рухаецца, з кім-небудзь размаўляе. Маючы такое небеларускае аблічча (бацька — амерыканец італьянскага паходжання), Павал сярод усіх ці не самы заняты па духу беларус. Ва ўсякім разе ў Беларусі ён адчува[е ся]бе сваім.



Удзельнікі гуртка Віктар ТУР і Коля БАХАР.

Коля — мала[дз]шы на пару гадоў за Павала. Русы, сінявокі славянін. Стрыманы, негаваркі. Вучыцца на фінансавым факультэце універсітэта. А Павал па спецыяльнасці — эканаміст. Але работа, як ён сказаў, не задавальняе, таму збіраецца сёлета паступіць ва універсітэт, каб вучыцца на доктара.

Аня Бартуль — дантыст. Нядаўна распачала прыватную практыку. Кліентаў у яе пакуль што няшмат. У ліку першых — свае, суайчыннікі. Даводзіцца многа працаваць і ў выходныя дні таксама, бо гэта зручна кліентам.

І яшчэ двое з адной сям'і — Юрка і Алеся Кіпелі. Юрка — доктар медыцыны, дзіцячы ўрач. Чалавек вельмі мэтанакіраваны, дзейны. Па ўсяму відаць, ён добры спецыяліст і яго любяць дзеці. Спагадлівасць да хворых, бездапаможных — у яго з дзяцінства. Калі вучыўся ў школе, то разам з сябрамі хадзіў у шпіталі, дзе ляжалі цяжкахворыя, рабіў усю самую чорную работу. Пасля скончыў універсітэт, «медычную» школу, 3 гады спецыялізаваўся па педыятрыі ў шпіталі, дзе кожную чацвёртую ноч меў дзяжурства.

Дарэчы, сёлета Юрка будзе бацькам. Хаця жонка яго і амерыканка (разам з ёю ён быў у Беластоку), можна быць упэўненым, што іх дзіця будзе ведаць, з якога яно роду-племені і што карані ягоныя ў беларускай зямлі.

Сястра Юркі, Алеся, мае надзвычай прэстыжную ў ЗША прафесію — яна адвакат. Між іншым, спецыяліст такога класа, што яе часта запрашаюць весці свае справы розныя замежныя фірмы. У Мінск Алеся прыляцела з ФРГ, дзе цяпер працуе. Калі даведалася, што «Васілёк» едзе ў Беларусь, паведаміла, што дзе б яна ні знаходзілася — будзе з імі разам. З Алесяй мы неяк разгаварыліся падчас купальскага свята ў Вязынцы. Спадабалася яе манера лагічна, стройна выкладаць думкі і разам з тым мяккасць, добразычлівасць, спагадлівасць.

Брат і сястра Дарота і Пётр Рыжыя. Яны, прынамсі, адзіныя з моладзі «Васілька», што нарадзіліся не ў ЗША. Трапілі ў Амерыку з Польшчы ўсяго 7 гадоў назад. Цікава, што будучы беларусамі па паходжанні, ні Пётр, ні Дарота, жывучы ў Польшчы, не размаўлялі па-беларуску. А ўсвядомілі сябе беларусамі ўжо ў Амерыцы, як далучыліся да арганізацыі Беларуска-амерыканскай моладзі ў Нью-Йорку. Пётр — будучы матэматык, хоча працаваць настаўнікам, бо любіць дзяцей, Дарота вучыцца ў школе.

Блізняты Коля і Галя Бахар прыйшлі ў «Васілёк» дзецьмі. Галя цяпер інжынер касметычнай кампаніі ў Нью-Йорку, а Коля займаецца фінансавымі справамі ў адной з кампаній Саўт Рывера. Штотыдзень ён ездзіць на машыне на рэпетыцыю гуртка. Да ўсяго Коля — майстар па вырабу такой неабходнай для «Васілька» рэчы, як лапці. Навучыў яго плесці гэты патрыярхальны беларускі абутак адзін стары дзед.

Віктар Тур — спецыяліст па камп'ютэрах, працуе ў банку. А нарадзіўся ў Лондане, дзе таксама наведваў беларускую школку, спяваў у хоры. Воляю лёсу трапіў у ЗША, дзе на вяселлі ў Юркі Азаркі, а было гэта 10 гадоў назад, пазнаёміўся з «Васількам». З таго часу з гуртком не разлучаецца.

Ліда Данілюк, па адукацыі мастак, займаецца рэкламай.

Надзя Захаркевіч з беларуска-амерыканскай сям'і.

Вера Запруднік — спецыяліст па менеджменту. Вырасла ў даволі забяспечанай сям'і, атрымала добрую адукацыю. З 18 гадоў пачала працаваць. Па словах дзяўчыны, гэта было выклікана не неабходнасцю, а ўласным жаданнем спазнаць жыццё, большага дасягнуць.

Хіба што і ўвесь «Васілёк». Акрамя, мусіць, Паўліны Сурвілы, якая добраахвотна ўзялася «фільмаваць» паездку, ды яшчэ дзвюх кабет — Веры Бартуль і Надзі Кудасавай. Абедзве яны, хаця ўжо і не з'яўляюцца ўласна ўдзельнікамі «Васілька», маюць самае непасрэднае дачыненне да яго спраў. І Надзя, і Вера дапамагаюць гуртку з касцюмамі. (Пра касцюмы будзе гаворка асобна.)

...Мокрыя да ніткі, ледзь жывыя, як мне здалося, скончылі «свае першыя практыкі» на сцэне Палаца прафсаюзаў у Мінску нашы замежныя, калі можна так сказаць, самадзейныя артысты. Яны моцна хваляваліся перад першым выступленнем. Нават на вячэру не пайшлі. Адзінае, што мне хацелася тады сказаць ім: «Усё будзе добра, мы таксама хвалюемся. Ваш канцэрт — не экзамен, а добрая сустрэча беларусаў з Амерыкі і з Беласточчыны на мацерыку. І ад нас цяпер залежыць, ці зразу[меем] мы адзін аднаго праз сто[ль]кі гадоў зацятага маўчання, непрыязнасці і непрыняцця, ці знойдзем агульную мову».

...Зала стоячы вітала гасцей. Апранутыя ў беларускія строі, яны цяпер ужо ніяк не былі па[добн]ыя на амерыканцаў. Ну зу[сім] свае, мясцовыя артысты, аднекуль з Брэстчыны. І прыгадалася сказанае Алай Орса-Рамана: «Мы — не прафесіяналы, для душы танцуем. Як кіраўнік, я патрабую ад удзельнікаў «Васілька» духоўных здольнасцей». Што гэта азначае? Якімі духоўнымі здольнасцямі павінны валодаць члены гэтага калектыву? З цікавасцю сачу за рухамі хлопцаў і дзяўчат, імкнучыся ўлавіць тое адметнае, што складае своеасаблівасць іх манеры выканання. А яна ж ёсць, безумоўна, ёсць. Мабыць, у вельмі тонкім адчуванні характару народнага танца, увогуле нацыянальнага тэмпераменту. А дзеля гэтага, мусіць, якраз і патрэбны духоўныя здольнасці, пра якія казала кіраўнік калектыву. Духоўныя здольнасці, каб выступаць з беларускімі танцамі сярод розных аўдыторый, «рэпрэзэнтаваць» беларускую культуру ды пазнаваць беларускую спадчыну самім. Дарэчы, менавіта з апошняга яны і пачалі. Хадзілі з маленства ў беларускія школкі пры цэрквах, вучылі мову, гісторыю, фальклор Беларусі. Іх выступленні з танцамі заўсёды суправаджаліся інфармацыяй пра Беларусь. І цяпер, стаўшы дарослымі, тыя з іх, хто жыве ў іншых штатах, штотыдзень едуць у Нью-Йорк, каб «мець практыку ў танцах». Нязменны кіраўнік гуртка з 1956 года, Ала Орса-Рамана выхавала ўжо не адно пакаленне танцораў... Цяпер гурток «Васілёк» шырока вядомы ў Нью-Йорку. Яго запрасілі ў сябры Нью-Йоркскага клуба народных танцаў — вельмі аўтарытэтнай і вядомай арганізацыі. За 35 гадоў існавання гэтага калектыву яго танцоры ўдзельнічалі ў сотнях выступленняў на розных сцэнах Амерыкі і Канады, а таксама па тэлебачанні. Дзесяткі беларускіх культурных фестываляў у Амерыцы адбыліся дзякуючы энтузіязму маладых танцораў-аматараў «Васілька». Працу для Беларусі яны выконваюць і цяпер.

...Два канцэрты ў Мінску прайшлі паспяхова. Нягледзячы на тое, што лета — пара водпускаў, вялікая зала Палаца прафсаюзаў была запоўнена. Для многіх з'явілася адкрыццём, што ў Амерыцы існуе такі беларускі калектыў, і ўжо зусім моцна ўразіла тое, што ўсе ўдзельнікі «Васілька», хаця і не былі ніколі дагэтуль на зямлі бацькоў, лёгка гавораць па-беларуску, спяваюць нашы песні. Таму з залы на сцэну перадаваліся дзесяткі запісак. Людзей цікавіла ўсё: як яны вывучылі мову, ці ўсе беларусы ў Амерыцы свядомыя, прасілі расказаць пра эміграцыю, пыталіся, якое іх сённяшняе ўяўленне пра Беларусь, адкуль бяруць матэрыял для танцаў, як і хто стварае сцэнічныя касцюмы, якія святы адзначаюць, якія друкаваныя выданні з Беларусі атрымліваюць, ці ёсць у Штатах свой беларускі музей, ці хацелі б прыехаць жыць у Беларусь...

На ўсе гэтыя пытанні адказвала Ала Орса-Рамана. Але час сустрэчы-канцэрта абмежаваны, таму і пасля выступлення артысты доўга былі абкружаны натоўпам моладзі. Госці з Амерыкі не стамляліся расказваць, дзяліліся сваімі першымі ўражаннямі, абменьваліся адрасамі, давалі інтэрв'ю журналістам.

Гэтая нефармальная сустрэча беларускай моладзі з Савецкай рэспублікі, з Беласточчыны і з Амерыкі мела свой працяг вечарам у Вязынцы, дзе было наладжана Купалле. Як і водзіцца ў гэтую ноч, спявалі купальскія песні, марылі пра шчаслівую будучыню. І толькі моцны дождж, ад якога не схавацца пад дрэвам, прымусіў вярнуцца ў аўтобус, які для «Васілька» і «Жывіцы» стаў ужо амаль што родным домам.

Таццяна АНТОНАВА.



Танцуе «Васілёк». Фота С. КРЫЦКАГА.

З ЧУЖЫХ СТАРОНАК

«ПАН» ЦІ «СПАДАР»

У Беластоцкай «Ніве» зъявіліся разважаньні нашага Беластоцкага пісьменніка, прафэсара і грамадзкага дзеяча А. Баршчэўскага (А. Барскі) аб досыць новым Беларускім тэрміне, запрапагаваным памёрлым Беларускім філёлагам драм Янкай Станкевічам: «спадар». «Новым» у Беларускай мове гэты тэрмін можна аднак назваць толькі адносна, бо ёсьць фактам, што выкапаў і прысвоіў яго Беларускай мове эмігрантаў др. Янка Станкевіч з «Аль Кітабу», рэлігійных рукапісаў Беларускіх Татараў, якія пісаліся ў сярэднявечнай Беларускай народнай мове, але Арабскім альфабэтам. Гэтае слова зчасам выйшла з ужытку на Беларусі ў сувязі з павялічваючыміся Польскімі палітычнымі і культурнымі ўплывамі на Беларусі пераняцьцем ад Палякоў замест тэрміну «спадар» — слова «пан».


Прапанаваны др-ам Я. Станкевічам стары Беларускі тэрмін «спадар» не прыняўся на Зах. Беларусі пад Польшчай, хутчэй з палітычных прычын, бо Янку Станкевіча не гледзячы на ягоны нацыяналізм лічылі паляна-філам, прычым найвялікшая на З. Беларусі палітычная плынь, якая ахоплівала хіба кіх 60—70% ўсяго насельніцтва — Грамадаўская плынь прытрымоўвалася нашаніўскай тэрміналёгіі. У зваротах і перапісцы ўжывана старога сялянскага тэрміну: «дзядзька», «цётка», калі ж да малодшага, роўнагодняга: «браток», «браце», «сястрыца», «сябра». Пасьля Першае Сусьветнае вайны і камуністычнага перавароту, гэтыя тэрміны пачалі зьнікаць пад Саветамі прымусова, а ў Беларусі, пераняўшы Польскае «пан», ужо да таго бытаваўшы на Беларусі, хоць і ў вузейшым сэнсе. Грамадаўская плынь і далей амаль што да Другой вайны карысталася старым тэрмінам: «дзядзька», «цётка», «браток» і г. п. Пасьляваенны выхад за мяжу Беларусі зьмяніў склад Беларускае грамадскасьці. Панаваньне над гушчай Беларускай шэрай масай уцекачоў, ці то зпачатку ў УНРАўскіх лагерах у Нямеччыне, ці потым у краях асяленьня перайшло ў рукі нацыяналістычных груп, сярод якіх апыніўся і ініцыятар прывярненьня Беларускай мове закіненага тэрміну «спадар» замест «пан». У іх руках аказаліся і сяродкі друкаванага пераказу. Зразумела гэта спапулярызавала выкапанае др. Янкай забытае архаічнае Беларускае слова «спадар», проціў чаго ня мелі вялікшых падстаў выступаць і апыніўшыся за мяжой астаткі Грамадоўцаў (Двупагоньнікаў). («Сябра» ўжываны ў Грамадаўскіх колах, — гэта тэрмін так казаць унутраны і адпавядае тэрмінам: «калега», «прыяцель», «таварыш» у іншых мовах і між іншым пераняты Беларусамі ад Жыдоў, бо гэбрэйскае «шабра» абазначае «зямляк», іначай кажучы: тутака народжаны (у Палестыне). Трэба дадаць аднак, што тэрмін «спадар» не пераняты цалкам усёй Беларускай эміграцыяй. Гэтак званая «бэцэраўская» плынь — астроўшчыкаў у процідзеяньні «абрамчыкаўцам — псэўдабээнэраўцам» высунулі з помыслу іх правадыра Радаслава Астроўскага свой тэрмін замены слова «пан» на народнасялянскае: «гаспадар» — «гаспадыня», які і сяньня яшчэ ўжываецца ў іхных вельмі рэдкіх выданьнях і выступах.

др. Я. ГАЛЕЙКА.
(«Беларускі Голас», Таронта).

(Захоўваем правапіс арыгінала).

ПАДАРУНАК РОДНАМУ МІНСКУ

Мастакоўская сцяжына спрадвеку была нялёгкай для тых, хто свядома прысвяціў сваё жыццё мастацтву. З цягам часу наступае такі момант у творчым жыцці, калі, падсумоўваючы пройдзены шлях, адкрываеш для сябе галоўную тэму, да якой міжволі імкнуўся ўсё жыццё. Такое ўражанне засталося ў мяне ад гутаркі са скульптарам Барысам Лазарэвічам. Менавіта яго апошні твор, прысвечаны Ф. Скарыне, які быў зроблены ў час летняга пленэру, арганізаванага скульптурнай секцыяй Саюза мастакоў БССР, стаў тэмай нашай размовы.



Не выпадкова Б. Лазарэвіч узяўся за стварэнне скульптурнага партрэта першадрукара. Аўтар паказаў занатаваныя эскізы і накіды, якія рабіў многа гадоў назад. Па свайму характару ён належыць да такіх творцаў, якія не спяшаюцца сваю першую задуму тут жа рэалізаваць у матэрыяле і несці на выставу. Ідэя паступова выспявае, набывае з цягам часу больш канкрэтную завершанасць, пластычную выразнасць і толькі пасля прыдзірлівага аналізу пакідае сцены майстэрні.

Безумоўна, фігура тытана эпохі Адраджэння Ф. Скарыны шматгранная. Да гэтага часу не ўсе мастакі, якія браліся за такую тэму, здолелі ў жывапісных палотнах, графічных аркушах раскрыць яго глыбінны духоўны свет.

Яшчэ задоўга да мінулагодняга летняга пленэру скульптар быў унутрана падрыхтаваны да такой адказнай і складанай тэмы. У сціслы тэрмін (спатрэбілася каля трох месяцаў) бясформенная каменная глыба стала ў руках майстра велічнай скульптурай, якую аўтар падарыў гораду.

Помнік стаіць цяпер у маляўнічым кутку беларускай сталіцы каля ракі Свіслач. Нягледзячы на буйную «лепку» ўсёй фігуры, якая пазбаўлена залішняй дэталізацыі, што дае магчымасць успрымаць скульптуру як зблізу, так і здалёку, «жыць» ёй у гарадскім асяроддзі. Дакладна выверааныя аўтарам памеры скульптуры дазваляюць чалавеку адчуць сябе сумаштабным твору. Невялікі чорна-шэры гранітны пастамент, хоць і выконвае сваё функцыянальнае прызначэнне (фігура крыху ўзвышаецца над зямлёй), але разам з тым адчуваецца непарыўная з ёю сувязь, пра якую заўсёды памятаў Ф. Скарына.

НА ЗДЫМКАХ: скульптар Б. ЛАЗАРЭВІЧ; помнік першадрукару.

У. ПРАКАПЦОЎ.

ФІЛЬМ АБ КРЫЧАЎСКІМ ПАЎСТАННІ СЯЛЯН



УРАГАН НА БЕЛАЙ РУСІ

Недалёка ад Мінска на здымачнай пляцоўцы кінастудыі «Беларусьфільм» заканчваюцца натурныя здымкі гістарычнай карціны «Маці ўрагана». Рэжысёр-пастаноўшчык і галоўны аператар гэтай эпічна-гістарычнай драмы заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Юрый Марухін гаворыць аб сваёй рабоце:

— Наш фільм з'яўляецца экранізацыяй аднаго з лепшых твораў — малавядомай п'есы цудоўнага беларускага пісьменніка і драматурга Уладзіміра Караткевіча. Па свайму жанру п'еса «Маці ўрагана» — трагедыя.

Драматургіі тэатра не процілаказаны кінематограф. Яна патрабуе самастойнага, дакладней, спецы[illegible]ага сцэнічнага «прачытання[illegible]зму мы з аўтарам сцэнарыя драматургам В. Галаванавым вынеслі многія эпізоды на натуру, пашырылі геаграфію п'есы, перанеслі шэраг сцэн з павільёнаў студыі ў сапраўдныя, [illegible]дам уцалелыя гістарычныя [illegible]р'еры, як, напрыклад, палацы і замкі князёў Радзівілаў.

У аснову як п'есы, так і фільма пакладзены падзеі, якія адбываліся ў час сялянскіх хваляванняў у Крычаўскім старостве ў 1743—1744 гадах. Гэтыя хваляванні ўзарваліся паўстаннем пад кіраўніцтвам войта вёскі Селішча Крычаўскага староства Васіля Вашчылы. Яно ўспыхнула як пратэст і было накіравана супраць адміністрацыі староства і буйных арандатараў, якім князь Геранім-Фларыян Радзівіл аддаў на водкуп усю ўладу ў сваіх землях. А яны былі вялікія і працягваліся ад Кракава, Варшавы, Крычава і далей у Белую Русь. Пры Радзівілу ўзмацнілася паншчына, сталі непамернымі падаткі. Людзей не толькі абіралі, іх мучылі, калечылі катаваннямі, кідалі ў турмы, забівалі. Даведзены да галечы непамернымі паборамі народ наракаў, пасылаў сваіх хадакоў у Варшаву да караля са скаргамі на Радзівіла і яго слуг — войтаў, бургамістраў, стражнікаў і іншых. Але іх галасы заглушалі ўдарамі бізуноў.

Непасрэднай прычынай паўстання паслужыла беспакараная распуста, сквапнасць, садызм адкупшчыкаў князя Радзівіла братоў Гдаля і Шмуйла Ісакавічаў, якія спусташылі ўвесь край, узбагацілі казну сатрапа-князя і нажылі на поце і крыві народа мільённае багацце.

Сялянам шукаць абароны не было дзе. Крычаў да Расіі будзе далучаны толькі праз дваццаць гадоў пасля паўстання Васіля Вашчылы. Але і ў Расійскай імперыі не сціхаюць сялянскія хваляванні. З Украіны таксама чакаць дапамогі не даводзіцца. Тыя ж паны, гетманы, паншчына.

Даведзены да адчаю народ паўстаў. «Хто пасее вецер, той пажне буру». Ураганам пранеслася па Белай Русі паўстанне Васіля Вашчылы.

Як вядома, п'еса Уладзіміра Караткевіча — твор маштабны. У ім, акрамя галоўных дзеючых асоб, выведзена шмат эпізадычных персанажаў. Для тэатра гэтыя абставіны значна ўскладнялі пастаноўку. Для кіно ж цяжкасці былі ў іншым — усебакова ўзнавіць гістарычную хроніку той далёкай эпохі. Гэта не так проста. Напрыклад, замак князя Радзівіла мы знайшлі толькі ў Чэхаславакіі, дзе пры дапамозе чэшскіх рэстаўратараў мне і нашаму мастаку Ігару Тапіліну ўдалося амаль «дакументальна» адзняць на плёнку многія эпізоды, звязаныя з Крычаўскім паўстаннем Васіля Вашчылы і яго паплечнікаў — Васіля Ветра і «маці ўрагана» Агны Вецер.

— Прыступаючы да здымкаў фільма, — працягвае свой расказ Юрый Марухін, — я пераканаўся, што паэтычны строй п'есы Уладзіміра Караткевіча нельга перавесці на экран без істотных страт. Таму вырашана было падысці да экранізацыі п'есы іншым шляхам — не праз маштаб гістарычных падзей, а праз раскрыццё маштабу гістарычнай асобы.

Галоўным героем п'есы і фільма з'яўляецца Васіль Вецер, рэальная гістарычная асоба, адзін з паплечнікаў Васіля Вашчылы і адзін з кіраўнікоў народнага паўстання. У карціне ў ролі Васіля Ветра дэбютуе акцёр Брэсцкага драматычнага тэатра Аляксандр Гаманюк. Яму трэба стварыць вобраз чалавека добрага, мяккага, які спачувае ўсім чалавечым болям, але насцярожана ставіцца да грубасці і кабацкай разбэшчанасці паўстанцаў.

Пэўна, трэба сказаць, што ролю «маці ўрагана» Агны Вецер выконвае вядомая актрыса Людміла Палякова.

У ролях Магды Мяганькай і Лаўрэна Калбяса заняты акцёры беларускіх тэатраў Таццяна Мархель і Уладзімір Мішчанчук. Акрамя таго, у фільме здымаліся такія папулярныя акцёры, як Генадзь Гарбук, Аляксандр Філіпенка і многія іншыя.

У карціне занята вялікая колькасць дзеючых асоб, на ролі якіх запрошаны многія акцёры не толькі беларускіх тэатраў, але і артысты з Масквы, Ленінграда, Прыбалтыкі.

Пастаноўка гэтага складанага гістарычнага кінаапавядання ажыццяўляецца на студыі «Дыялог» (мастацкі кіраўнік народны артыст БССР Ігар Дабралюбаў) кінастудыі «Беларусьфільм». На экраны фільм выйдзе ў двух варыянтах — беларускім і рускім.

— Я спадзяюся, — гаворыць рэжысёр-пастаноўшчык карціны Юрый Марухін, — што наш фільм своечасова ўвойдзе ў працэс нацыянальна-культурнага адраджэння рэспублікі.

Яўген КРУПЕНЯ.

НА ЗДЫМКУ: кадр з фільма «Маці ўрагана».

СТВОРАНА АСАЦЫЯЦЫЯ

У алімпійскім лагеры «Стайкі» адбыўся ўстаноўчы з'езд, на якім створана Асацыяцыя спартыўнай прэсы (АСП) Беларусі. Гэта будзе самастойная добраахвотная грамадская творчая арганізацыя, яна аб'яднае асоб, якія асвятляюць тэмы фізічнага выхавання і спорту ў сродках масавай інфармацыі, і будзе працаваць у цесным кантакце з Саюзам журналістаў БССР, Дзяржкамспортам рэспублікі, спартыўнымі і іншымі зацікаўленымі арганізацыямі. АСП будзе мець свой статут, эмблему, флаг, а яе члены — нагрудны знак. Прадугледжваецца выданне вучэбных, даведачных, метадычных дапаможнікаў, інфармацыйных выданняў, будзе друкаваны орган.

Але галоўнай задачай Асацыяцыі з'яўляецца прапаганда здаровага ладу жыцця, далучэнне людзей да рэгулярных заняткаў фізічнай культурай і спортам, арганізацыі вучобы асоб, якія пішуць на фізкультурныя і спартыўныя тэмы.

Старшынёй Асацыяцыі спартыўнай прэсы БССР выбраны ўласны карэспандэнт газеты «Советский спорт» па Беларусі А. Барысевіч.

З ФРАНЦЫІ — НА РЫСАКАХ

У адзін з дзён у калгасе «Запаветы Леніна» Бярозаўскага раёна, што на Брэстчыне, спыніўся на начлег гаспадар двух коней француз Жан Луі Гуро. Як мы паведамлялі ўжо, 47-гадовы коннік-спартсмен задаўся мэтай здзейсніць падарожжа на конях па маршруту Парыж—Масква. Стартаваўшы 1 мая ад Эйфелевай вежы, Жан Луі Гуро ўвесь час знаходзіцца ў дарозе. Ён ужо пераадолеў амаль тры тысячы кіламетраў. Кожны дзень на сваіх гнядых прыгажунах-рысаках праязджае 50—60 кіламетраў. Ззаду дарогі Францыі, ФРГ, ГДР, Польшчы.

— Мая галоўная мэта такога незвычайнага і цяжкага шляху, — расказвае Жан Луі Гуро, — пазнаёміцца з жыццём і бытам савецкіх людзей, падтрымаць ідэі перабудовы. На першых кіламетрах вашай краіны я адчуў іх сардэчнасць і гасціннасць, убачыў іх шчырыя ўсмешкі. Запомніцца мне і калгас «Запаветы Леніна», дзе давялося спыніцца на начлег.

Французскі коннік прывёз у Маскву добрыя пажаданні і спадзяецца перадаць двух рысакоў французскай пароды савецкаму Прэзідэнту М. С. Гарбачову. У гэтым рашэнні яго падтрымала сям'я — жонка, дачка. Дарэчы, жонка праводзіла мужа да савецка-польскай граніцы і сустрэла яго ў Маскве ў дзень завяршэння падарожжа, 14 ліпеня.

Некалькі слоў пра Жана Луі Гуро. Жыве ў Парыжы. Працуе ў выдавецтве «Караколь», якое спецыялізуецца на выпуску літаратуры пра конны спорт. Падобныя падарожжы на конях здзейсніў па дарогах Афрыкі, Кітая, Індыі і іншых краін.



Другі асабіста-камандны чэмпіянат СССР па гонках на велатандэмах сярод сляпых адбыўся ў Мінску. Арганізатарам яго стала Беларускае таварыства сляпых. У мінулым годзе ў першым падобным спаборніцтве ўдзельнічалі толькі 9 экіпажаў. У гэтым — ужо каля 50 велагоншчыкаў з Масквы, Ленінграда, саюзных рэспублік. У праграме спаборніцтваў — гонкі з выбываннем для ўсіх узроставых груп, мужчынская групавая гонка. Сярод пераможцаў ёсць і беларускія спартсмены.

НА ЗДЫМКУ: на трасе.

Фота У. ШУБЫ.

ЧЭМПІЁН З БЕЛАРУСКІМ АКЦЭНТАМ

Усе былі ўпэўнены, што ў балгарскім горадзе Стара-Загора баскетбольныя «зоркі» не растуць. Але летась мясцовая каманда «Электрон» раптам увайшла ў эліту жаночага баскетбола. І ўсё ж нават самыя адчайныя аптымісты не маглі прадугледзець тады, што «Электрон» стане чэмпіёнам...

Новы старшы трэнер каманды Марын Цанкаў разумеў, што са спартсменкамі сярэдняй рукі і з сярэднімі мэтамі на многае разлічваць не даводзіцца. Але ж за плячамі ў «Электрона» стаіць сур'ёзная фірма «Дыскавыя запамінальныя ўстройствы».

І вось восенню 1988 года ў яго з'явілася шалёная ідэя: залучыць у сваю правінцыю савецкіх «зорак». Так у шэрагах «Электрона» з'явіўся яркі, самабытны [illegible] — мінчанка Ірына Губа.

— Не ўсё ў нас з Ірынай ладзілася, — гаворыць Марын, — таму што ў абодвух яршыстыя характары. Але потым прывыклі, зрабілі адзін аднаму маленькія ўступ[illegible] [illegible] усіх савецкіх баскетба[illegible]ак, хто выступае цяпер у балгарскіх камандах, Ірына дэманструе самую стабільную ігру і прафесійныя адносіны да справы. Нягледзячы на тое, што прайшло нямала часу з таго моманту, калі яна завяршыла сваю кар'еру ў моцным «Гарызонце», Іра хутка ўвайшла ў форму, прыцягнула ўвагу патрабавальных спецыялістаў і публікі, даказала, нарэшце, што ўзрост у баскетболе — зусім не перашкода.

Разам з Ірынай у Стара-Загору прыехала яшчэ адна мінчанка—Наталля Ткачова. І хаця яна дапамагала «Электрону» толькі ў трэніроўках, на думку трэнераў, бясспрэчна, унесла сваю лепту ў перамогу.

Не ведаю, ці паспелі забыць Ірыну ў Мінску, але старазагорская зала, калі з'яўляецца гэтая спартсменка, бурна скандзіруе: «Гу-ба! Гу-ба!». Журналісты з поўным правам пішуць пра яе, што яна, як аса, — настойлівая і вострая, што яна рухомая, як ртуць, як дырыжор, ведае, калі павялічыць, а калі замарудзіць тэмп атакі.

— Чамаданы ў Балгарыю збірала з трывогай у душы, — гаворыць Ірына. — Бо гэтая краіна з добрымі традыцыямі ў жаночым баскетболе. Думала, што я там буду адкрываць? Ды і ўзрост для спартыўных подзвігаў непадыходзячы. Але потым усё прайшло. На месцы я зразумела, што большасць балгарскіх каманд не абучаны ігры ў абароне. З такой «настройкай» яны не могуць аказацца сярод першых скрыпак сусветнага «аркестра». Увесь свой вопыт і ўвагу засяродзіла менавіта на гэтым кампаненце гульні. У камандах-саперніцах выступалі моцныя спартсменкі (некаторыя з іх у гэтым сезоне апранулі майкі прафесіянальных французскіх клубаў), якіх сустракалі авацыямі. Але і мы з Ткачовай у ценю не стаялі. Нам таксама апладзіравалі, і мы лічылі, што цалкам апраўдваем тыя 530 леваў у месяц, якія нам плаціў клуб.

[illegible]водзіны Ірыны на трэні[illegible]ўках і ў час матчаў пацвярджаюць, што яна не шукае лёгкага жыцця і вялікіх грошай. Яна служыць баскетболу. І тое гучнае «Гу-ба! Гу-ба!» у [illegible]аленькай зале — для яе вы[illegible]шая ўзнагарода.

Р. УРУМАЎ.







Значна павялічыўся час работы магілёўскага Дома спорту, калі на яго базе пачаў дзейнічаць фізкультурна-аздараўленчы кааператыў «Рытм». З шасці гадзін раніцы і амаль да адзінаццаці вечара яго дзверы адчынены для ўсіх жадаючых набыць бадзёрасць і здароўе. У «Рытме» кваліфікаваныя інструктары-метадысты навучаць плаваць, дапамогуць скінуць лішнюю вагу, выправіць паставу. У хлопцаў вельмі папулярная зала атлетычнай гімнастыкі. З дапамогай розных трэнажораў, а таксама сістэмы сілавых практыкаванняў неаднаразовы пераможца ўсесаюзных спаборніцтваў па атлетызму Уладзімір Шкаруба дамагае дзецям умацоўваць мышцы, трэніраваць цела.

НА ЗДЫМКАХ: у зале займаюцца цяжкаатлеты; студэнтка педагагічнага інстытута Алена ГАЛКІНА любіць гімнастыку; трэнер па плаванню Юрый ВІНАГРАДАЎ займаецца з малымі.

Фота С. ЖАЛУДОВІЧА.

ТУРНІРЫ, ПЕРШЫНСТВЫ, СУСТРЭЧЫ

БОКС. У польскім горадзе Згожэльцы прайшоў міжнародны турнір. Гонар нашай рэспублікі абаранялі спартсмены Гомельшчыны. Яны і заваявалі галоўны прыз.

БАРАЦЬБА КЛАСІЧНАЯ. Другое камандное месца. Адзін залаты і адзін сярэбраны медалі атрымалі Ш. Абасаў і К. Маджыдаў. Такі вынік выступленняў беларускіх спартсменаў на чэмпіянаце краіны па класічнай барацьбе, які прайшоў у Кішынёве.

СУЧАСНАЕ ПЯЦІБОР'Е. Міжнародны турнір на прыз Дзяржтэлерадыё БССР адбыўся ў Мінску. Сярод жанчын упэўненую перамогу атрымала польская спартсменка Ганна Суліма. Камандай былі мацнейшымі італьянкі.

А вось сярод мужчын вельмі ўдала выступілі гаспадары — беларускія пяцібор'цы. Мінчанін Сяргей Ціхановіч набраў найбольшую колькасць ачкоў у асабістым заліку. Перамогу атрымала і каманда БССР-3, за якую выступаў і лідэр спаборніцтваў.

ХАКЕЙ НА ТРАВЕ. Спартсмены Кубы, Кітая, Польшчы, ГДР і СССР прынялі ўдзел у міжнародным турніры. Спаборніцтвы прайшлі ў Брэсце.

Зборная нашай краіны, за якую выступалі мінчане Халопаў і Чабатароў, дагэрмінова заваявала першае месца.

ВАЛЕЙБОЛ. Чарговы этап розыгрышу Кубка Савецкага Саюза добра правяла каманда мінская «Камунальніка». Яна выйграла занальныя спаборніцтвы ў Ленінградзе і выйшла ў наступны круг.

ГІМНАСТЫКА. Святлана Багінская і Віталь Шчэрба першымі сярод беларускіх спартсменаў атрымалі пуцёўкі на ўдзел у Гульнях добрай волі, якія адбудуцца ў амерыканскім горадзе Сіэтле.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:
220600, МІНСК, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Індэкс 63854. Зак. 947